Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СУБОТА №209 (28573)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Хто адказвае за нашу бяспеку?

СТАР. 4–5



## Беларускія фотамастачкі ў Берліне

СТАР. 8



## Куды рушыць Кітай?

СТАР. 13

# Фізкульт-хвілінка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На дзіцячай спартпляцоўцы ў Мінску.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння ў нас 11 відаў дапамог для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Іх атрымліваюць больш за 550 тысяч дзяцей. У маштабах краіны гэта каля 30%. Сапраўды значная падтрымка. Дэмаграфічная бяспека, падтрымка шматдзетных сем'яў — прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. У 2015 годзе з'явіўся новы інструмент — сямейны капітал. І мы бачым актыўны рост колькасці шматдзетных сем'яў. Сёння іх больш за 95 тысяч. Больш за 43 тысячы адкрылі дэпазітныя рахункі. А гэта больш за 430 млн долараў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9734 | ▲ |
| Еўра | 2,2935 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0735 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17209

■ Прэм'ера рубрыкі

## Космас. Беларускі след

**Адкрываем новую рубрыку словамі выдатнага філосафа Эмануіла Канта: «У свеце ёсць дзве рэчы, якія чым больш пра іх думаеш, тым больш яны здзіўляюць: высокае неба над намі поўнае зоркамі маральны закон унутры нас».**

Калі ўсё мінулае стагоддзе магутны трэнд у асваенні космасу практычна не закранаў звычайнага чалавека (хіба што ўтылітарнае выкарыстанне маланак у вопратцы і дарожных сумках і чамаданах ды яшчэ цюбікі з зубной пастай), то касмічныя дасягненні ўжо зусім іншай уласцівасці і парадку ўварваліся ў паўсядзённае жыццё зямлян яшчэ за пяцігодку да міленіуму. І гэта было зусім нядаўна. Сотавая сувязь і камп'ютарная тэхніка, як у самых сапраўдных касманаўтаў і астранаўтаў, даступная цяпер практычна кожнаму, хто мае мінімальны дастатак. Але космас — гэта не толькі і не столькі тэхнічныя дасягненні, але яшчэ і бязмежная філасофія Сусвету, найвялікшая музыка сфер, якія суправаджаюць нас кожнае імгненне незалежна ад нашага жадання, спім мы ці не. Атрымаць асалоду ад гэтых дароў светабудовы мы абавязаны не адкладаючы на заўтра, паколькі ўступілі як цывілізацыя ў адказную пару сталасці — Восень чалавечага быцця. Менавіта цяпер, калі бязлітасны хаос прыроды ўжо падрыхтаваўся ў завяршальным зруйнавальным скачку разарваць нябёсы і зямлю, прыносячы бедства мільёнам, прыйшоў час зразумець і выкарыстаць нашы ўменні ў касмічнай галіне, каб як найхутчэй і як мага далей адтэрмінаваць завяршальны фінал Зімы для нашай планеты. Гэтай рубрыкай і мы ўносім свой уклад у важную справу сучаснасці.

У ёй вы адкрыеце для сябе дзіўны свет касмічных пошукаў працаўнікоў Сусвету, народжаных на нашай блаславёнай зямлі. Разам з касмаганістамі Скарынам, Семяновічам, Драздовічам, Шмітам будзем узірацца ў касмічныя далі. А разам з касманаўтамі Клімуком, Кавалёнкам і Навіцкім (і не толькі імі) — праводзіць разбор палётаў мінулых гадоў і рыхтавацца да новых падарожжаў да далёкіх планет. Разам з навукоўцамі Беларускай Акадэміі навук будзем чараваць над новымі вынаходкамі і даставаць з глыбокіх архіўных падвалаў сусветныя дасягненні, якія з-за пэўных абставін засталіся за кадрам папулярнай касмічнай гісторыі. Разам са студэнтамі тэхнічных ВНУ краіны будзем дыскутаваць пра будучыню міжпланетных і міжзоркавых палётаў і пра тое, як зберагчы нашу Зямлю ад разнастайных небяспечных праяў касмічнай актыўнасці. І яшчэ шмат цікавага. Вядома ж, будзем адказваць і на вашыя пытанні, бо пра што, як не пра космас, іх задаваць і атрымліваць самыя цікавыя адказы. Новая рубрыка стане той гімнастыкай для розуму, якая «отвратит очи ваши, ибо не видите суеты» і зойме вашы думкі сапраўды сур'ёзнымі праблемамі выжывальнасці чалавецтва і ўсяго жывога на Зямлі.

Чакаем вашу касмічную пошту, і да хуткай сустрэчы!

СТАР. 12

■ Справы духоўныя

## ГАЛОЎНАЕ — ПАМАЛІЦЦА ЗА БЛІЗКІХ

### Як правільна ўспомніць пра нябожчыкаў у дзень памінання спачылых

**Сёння, 28 кастрычніка, у праваслаўным календары дзень асаблівага памінання спачылых — Дзімітрыеўская бацькоўская субота. Гэта апошняя магчымасць у гэтым годзе згадаць пра памерлых у дзень асаблівага памінання. Наступная будзе толькі ў лютым.**

Дзімітрыеўская субота была ўстаноўлена вялікім князем Дзмітрыем Данскім у найбліжэйшую суботу перад днём памяці яго нябеснага заступніка велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага (адзначаецца 8 лістапада) у памяць аб загінулых у Кулікоўскай бітве воінах. З часам памінанне толькі воінаў перарасло ў памінанне ўсіх праваслаўных хрысціян. 4 лістапада — гэта субота перад днём памяці Дзімітрыя Салунскага, але ў гэтым годзе з-за свята Казанскай іконы Божай Маці, якое прыпадае на тое ж чысло, памінальны дзень перанесены на тыдзень раней.

«Праваслаўнаму хрысціяніну ў Дзімітрыеўскую суботу трэба наведаць храм, пабыць на паніхідзе. Калі ёсць магчымасць, можна з'ездзіць на могілкі, — параіў **іерэй Раман АРЦЁМАЎ, клірык храма роўнаапостальнай Марыі Магдаліны ў Мінску, выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі, магістр філасофскіх навук.** — Трэба памятаць, што мэта памінальнай суботы не ў тым, каб ужыць пэўныя стравы. Мэта ўвогуле не ў тым, каб штосьці з'есці, а ў тым, каб прыйсці ў храм і памаліцца за нябожчыкаў. Наведаеце ў гэты дзень могілкі ці не — не самае галоўнае. Калі і атрымаецца на іх трапіць, то ніякіх прадуктаў харчавання мы на магілках не пакідаем і самі ежу на іх не ўжываем, бо такога кшталту традыцыі маюць язычніцкія карані. Максімум можна запаліць лампаду ці свечку, калі надвор'е дазволіць, і памаліцца».

Айцец Раман раіць праваслаўным вернікам падрыхтавацца і прычасціцца ў гэты дзень, калі не атрымаецца — хоць бы наведаць паніхіду. Для тых, хто нячаста наведвае храм, дае параду ў царкве маліцца сваімі словамі. «Гэта самы лепшы варыянт — размаўляць з Богам сваімі словамі, казаць Яму пра тое, пра што сапраўды баляць сэрца і душа. Пасля, калі чалавек увацаркавіцца, стане часткай Царквы, тады яму будзе лёгка маліцца і па малітваслове. А пакуль падыдзе і такі варыянт», — лічыць свяшчэннаслужыцель.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# РАБОЧЫ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка наведвае Аб'яднаныя Арабскія Эміраты з рабочым візітам, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Падчас паездкі запланаваныя перагаворы з кіраўніцтвам ААЭ для абмеркавання бягучага стану беларуска-эмірацкага ўзаемадзеяння, ходу рэалізацыі ранейшых дамоўленасцяў, а таксама ўзаемавыгадных перспектыўных праектаў. У праграме візіту таксама шэраг сустрэч з прадстаўнікамі ўлады і бізнес-колаў краіны.

Акрамя таго, улічваючы сяброўскі характар узаемаадносін, з боку кіраўніцтва Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў атрымана запрашэнне ў адрас Аляксандра Лукашэнкі традыцыйна некалькі дзён пагасціць у ААЭ.

■ Агульны інтарэс

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ЖАНОЧАМУ БІЗНЕСУ

## Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі грамадскія жаночыя арганізацыі Беларусі і Латвіі

**Візіт дэлегацыі жанчын-прадпрымальнікаў Латвійскай Рэспублікі на чале з намеснікам старшыні праўлення Асацыяцыі латвійскіх прыватных інвестараў, кіраўніком латвійскай няўрадавай арганізацыі «Таварыства «Лідэрэ» Айвай ВІКСНАЙ працягнецца да 29 кастрычніка, аднак подпіс пад дакументам яна паставіла ўжо ў першы дзень наведвання Мінска. З беларускага боку пагадненне падпісала старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна ШЧОТКІНА.**

Падпісанню папярэднічала абмеркаванне, цэнтральнай тэмай якога сталі асаблівасці вядзення і развіцця жаночага бізнесу. На думку Мар'яны Шчоткінай, беларускай і латвійскай грамадскім арганізацыям карысна абмяняцца напрацоўкамі ў гэтай сферы. Пагадненне прадугледжвае рэалізацыю сумесных праектаў па падтрымцы жанчын-прадпрымальнікаў. Акрамя таго, бакі абавязаліся працаваць на рэалізацыю палітыкі гендарнай роўнасці і дасягненне Мэт устойлівага развіцця.

— Некалькі гадоў таму пры дапамозе навуковых арганізацый латвійскія калегі распрацавалі праграму і методыку садзейнічання бізнесу на вёсцы, — расказала Мар'яна Шчоткіна. — Мы хочам паглядзець гэтую праграму, перапрацаваць у інтарэсах нашай дзяржавы.

Сустрэча аказалася каштоўнай і асабістымі знаёмствамі. «Сярод членаў дэлегацыі ёсць жанчына, якая ўжо 15 гадоў займаецца бізнесам у сферы адукацыі, у яе вялікая прыватная школа, больш за 600 вучняў. І гэты кірунак таксама цікавы для нас, паколькі прыватны сектар развіваецца, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. — Важна, каб кантакты ўсталяваліся на ўзроўні саміх прадпрымальнікаў Беларусі і Латвіі».

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі заўважыла, што мэты жаночых арганізацый па ўсім свеце заўсёды аднолькавыя: «Гэта — стабільнасць, мір, рост дабрабыту, годная праца і яе ўмовы, сям'я і бяспека».

Як расказала Айва Віксна, сёння ў Латвіі амаль 39% прадпрымальнікаў — гэта жанчыны, дзякуючы чаму краіна ўваходзіць у тройку лідараў па гэтым паказчыку ў Еўропе. Акрамя таго, у найбліжэйшы час у Латвіі пройдзе апытанне, у рамках якога жанчыны-прадпрымальніцы раскажуць пра свае бізнес-задачы і праблемы. «Мы хочам вызначыць тэндэнцыі ў развіцці жаночага бізнесу і стварыць новыя праекты па падтрымцы жанчын-прадпрымальніц, а таксама выступіць з ініцыятывамі па развіцці бізнес-асяроддзя ў цэлым», — растлумачыла кіраўнік «Лідэрэ».

Яна пацвердзіла, што супрацоўніцтва Беларусі і Латвіі ў галіне прадпрымальніцтва «не пачынаецца з чыстага ліста». «Аднак я думаю, што нам трэба працаваць метадычна, па плане, — пагадзілася Айва Віксна з Мар'янай Шчоткінай. — Гэта можа быць супрацоўніцтва ў сферы турызму, спорту і культуры. Яно ўжо адбываецца, але сумесна мы можам зрабіць больш».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Парламент Каталоніі абвясціў незалежнасць ад Іспаніі



Учора сенат Іспаніі зацвердзіў прымяненне артыкула 155 аб прамым кіраванні Мадрыда ў Каталоніі, паведамляе Reuters. У найбліжэйшы час іспанскі прэм'ер-міністр Марыяна Рахой правядзе экстраннае пасяджэнне кабінета міністраў для таго, каб вызначыцца з мерамі, якія будуць уведзены ў дачыненні да Каталоніі.

Крыху раней у той жа дзень Парламент Каталоніі абвясціў незалежнасць аўтаноміі ад Іспаніі. Рашэнне было прынята шляхам таемнага галасавання. Перад пачаткам працэдуры залу пакінулі дэпутаты ад апазіцыйных партый, якія выступаюць супраць аддзялення рэгіёна. За выхад са складу краіны прагаласавалі 70 дэпутатаў, супраць — 10, яшчэ два парламентарыі ўстрымаліся.

24 кастрычніка міністр адукацыі, культуры і спорту, афіцыйны прадстаўнік Мадрыда Іньіга Мендэс дэ Віга заявіў, што іспанскі ўрад можа выкарыстаць сілу для аднаўлення парадку ў Каталоніі, калі жыхары рэгіёна будуць выступаць супраць мер па ўрэгуляванні сітуацыі.

Трыма днямі раней Марыяна Рахой адхіліў ад пасады кіраўніка каталонскага ўрада Карлеса Пучдэмона. Такім чынам Мадрыд прывёў у дзеянне артыкул 155 Канстытуцыі Іспаніі, які дазваляе ўвесці часовае непасрэднае кіраванне аўтаноміяй.

## Трамп назваў крытычным распаўсюджванне наркотыкаў у ЗША

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвясціў надзвычайнае становішча ў ахове здароўя з-за распаўсюджвання апіятаў, паведамляе РІА «Навіны».

«У мінулым годзе з-за перадазіроўкі наркотыкамі загінулі 64 тысячы амерыканцаў», — сказаў ён, выступаючы ў Белым доме. Як заявіў амерыканскі лідар, у пераліку на душу насельніцтва Злучаныя Штаты лідзіруюць у свеце па колькасці наркаманаў. Паводле слоў Трампа, для абароны амерыканцаў ад наркотыкаў паштовая служба і міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША атрымаюць дадатковыя паўнамоцтвы па праверцы пасылак. Прэзідэнт таксама прыгразіў пераследаваннем кампаніям, якія вырабляюць і распаўсюджваюць некаторыя апіоіды оптам. Трамп адзначыў, што немалая частка гераіну і апіятаў вырабляецца ў Мексіцы і Кітаі. Гэтую праблему ён збіраецца абмяркаваць са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам падчас свайго візіту ў Пекін.

У студзені паведамлялася, што ў 2016 годзе жыхары ЗША і Канады патрацілі 53,3 мільярда долараў на куплю марыхуаны.

## Недахоп сну — лішнія калорыі



Паводле слоў супрацоўнікаў Каралеўскага каледжа Данэна, людзі, якія спяць менш за 7 гадзін у суткі, спажываюць на 385 калорый штодзень больш. З прычыны гэтага за тыдзень вага ў іх можа павялічыцца на 0,5 кілаграма. Спецыялісты падкрэсліваюць: недахоп сну падштурхоўвае людзей да ўжывання тлустых прадуктаў замест садавіны і агародніны, піша The Daily Mail.

Навукоўцы прааналізавалі даныя 172 удзельнікаў 11 даследаванняў. Даследчыкі ўстанавілі, што з-за недасыпання добраахвотнікі неабавязкова елі больш на наступны дзень. Аднак такія ўдзельнікі аддавалі перавагу прадуктам з высокай колькасцю тлушчу і нізкай колькасцю бялку. Людзі, якія не высыпаліся, спажывалі 385 лішніх калорый. Як правіла, гэтыя калорыі яны атрымлівалі з салодкіх батончыкаў, чыпсаў або печыва. Акрамя таго, добраахвотнікі, якія спалі менш за 7 гадзін, былі менш актыўныя на наступны дзень. Гэта таксама павышала рызыку набору вагі.

# Турбіна, што ўнутры нас

**Праект, які вучыць весці здаровы лад жыцця, стартаваў у Гомелі.**

Першыя мэтавыя групы сфарміраваны ў калектыве цэнтральнага апарата РУП «Гомельэнерга». Супрацоўнікі прадпрыемства ва ўзросце ад 25 да 50 гадоў выказалі жаданне адмовіцца ад шкодных звычак і пазбавіцца лішняй вагі. Праводзіць заняткі з імі будуць спецыялісты абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

Па словах загадчыцы аддзела грамадскага здароўя цэнтра Ірыны АТАРЫК, 60 чалавек, якія пагадзіліся ўдзельнічаць у праекце, падзялілі на тры групы: умоўна здаровых, з хранічнымі захворваннямі і з лішняй вагой. Энтузіясты спачатку прайшлі анкетаванне, дзе ацанілі сваё здароўе, апісалі ўласныя метады барацьбы са шкоднымі звычкамі. Больш за палову апытаных назвалі стан свайго здароўя здавальняючым. Праект прадугледжвае цыкл лекцый, практычных заняткаў, пастаянны кантроль харчавання і выканання карысных прывычак. Першыя заняткі з групамі ўжо пачаліся. Вынікі будуць падведзены праз год. Мэта праекта — выпрацаваць правіла сачыць за сваім здароўем і рэгулярна займацца спортам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Фонд для пагоды ў доме

## Нацыянальны сход заслухаў справаздачу ўрада

**На гэты раз перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі выступіў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН, які курыруе сферы будаўніцтва, транспарту, сувязі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

### СРОДКІ НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ

Лічбы, якія называў дакладчык, ужо гучалі з вуснаў прэм'ер-міністра на нядаўнім пасяджэнні Савета Міністраў, прысвечаным вынікам работы эканомікі за 9 месяцаў бягучага года. Калі коратка: станоўчая сітуацыя ў эканоміцы захоўваецца, але ёсць адставанне ад графіка па выхадзе на сярэдні заробак у адну тысячу рублёў. «Мы будзем імкнуцца. Задача пастаўлена выйсці на неабходныя параметры да канца года», — запэўніў віцэ-прэм'ер.

Інфармуючы дэпутатаў аб пытаннях, якія курыруе асабіста, Анатоль Калінін адзначыў, што ў краіне неабходна стварыць спецыялізаваны інвестыцыйны фонд для забеспячэння фінансавання мерапрыемстваў па цеплавой мадэрнізацыі жылога фонду. «Фонд можа быць сфарміраваны за кошт сродкаў ад продажу жылля, адлічэнняў грамадзян, сродкаў бюджэту, крэдытаў ЕБРР. Урадам на першым этапе прыцягваюцца сродкі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ў памеры 20 млн еўра для рэалізацыі пілотнага праекта па цеплавой мадэрнізацыі 65 жылых дамоў у Мінску. Асноўная задача — даведзенне ўдзельнага цепласпажывання жылых дамоў да ўзроўню 90 кВт на кв. м у год. Сёння гэтыя параметры ў 1,5—2 разы вышэйшыя», — растлумачыў віцэ-прэм'ер.

### УЛАДЫ ПАВІННЫ ШУКАЦЬ КАМПРАМІС

Даклад быў падрабязны і грунтоўны, але пасля віцэ-прэм'еру было зададзена шмат пытанняў. **Дэпутат ад Купалаўскай выбарчай акругі №95 Таццяна САЙГАНАВА** расказала пра тое, што да яе звярталіся жыхары дамоў, якія плануецца знесці з-за перапланіроўкі горада. «Людзей турбуе перспектыва пераезду з цэнтра горада ў спальныя раёны і гарады-спадарожнікі. Згодна з указам Прэзідэнта прадугледжана права грамадзянам на атрыманне жылплошчы ў раёне дома, які зносіцца, але толькі ў выпадку наяўнасці кватэр. Рашэнне, такім чынам, пераходзіць у распараджэнне інвестараў, а дзяржава жыхароў не абараняе. Можа, трэба прыбраць словы «толькі ў выпадку наяўнасці кватэр» з указа?» — спытала дэпутат меркаванне віцэ-прэм'ера.

Анатоль Калінін адказаў, што мясцовыя органы ўлады ў рамках дзейнага заканадаўства павінны вырашаць гэтае пытанне кампрамісна. «Калі ёсць канкрэтныя прапановы, мы гатовыя іх разгледзець. Разам з органамі мясцовай улады мы абмяркуем гэтую тэму і пачуем два бакі», — запэўніў віцэ-прэм'ер.

Пытанне **дэпутата ад Полацкай сельскай акругі №28 Андрэя ЮНІЦЫНА** датычылася дарог. «Плануецца, што да 2020 года мясцовыя дарогі будуць абноўлены. Узнікае пытанне аб далейшым іх утрыманні. Паводле інфармацыі Мінтранса, знос тэхнікі ў мясцовых дарожных гаспадарках досыць вялікі. Аналагічная сітуацыя ў рэспубліканскай дарожнай гаспадарцы. Толькі за кошт уласных сродкаў прадпрыемстваў і мясцовых бюджэтаў абнавіць парк гэтай тэхнікі немагчыма. Ці вядзецца падрыхтоўка адпаведнага ўказа і ў які тэрмін плануецца рашэнне гэтай праблемы?» — задаў пытанне дэпутат.

«Была прапанова крыніцай для мадэрнізацыі і развіцця дарожнай гаспадаркі выкарыстоўваць 10% інавацыйных фондаў мясцовага ўзроўню. Мы падлічылі, што на працягу трох гадоў зможам значна знізіць знос і мадэрнізаваць гэтую тэхніку. Зараз ствараецца план мерапрыемстваў і праграма па выбары такой тэхнікі. Я ўпэўнены, што за 2—3 гады мы вырашым гэтае пытанне», — паабяцаў Анатоль Калінін.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# Любая з пазіцый — рэвалюцыйная

## У Савеце Рэспублікі ўхвалілі змяненні ў Закон «Аб аўтарскім праве і сумежных правах»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА назвала ўсе новаўвядзенні рэвалюцыйнымі.**

— Важным пытаннем з'яўляецца захаванне балансу паміж інтарэсамі аўтара і шырокай грамадскасці, — адзначыла сенатар. — Таму гэты законапраект сапраўды вельмі важны. Канцэптуальна ён не мяняе прававыя адносіны ў гэтай сферы, але спрыяе больш сістэмнаму рэгуляванню пытанняў аўтарскага права і сумежных правоў.

Законапраект пашырае пералік выпадкаў вольнага выкарыстання правамерна абнародаваных твораў у сацыяльных сферах. Акрамя таго, удасканальваецца сістэма дагавораў, што заключаюцца пры стварэнні і выкарыстанні аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў. У законапраекце ўводзіцца паняцце «адкрытая ліцэнзія», удакладняецца прававы механізм спынення дагаворных адносін паміж аўтарам і арганізацыяй па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі.

— Ёсць яшчэ новае палажэнне, якое датычыцца падручнікаў. Гаворка ідзе пра тое, каб можна было выкарыстоўваць малааб'ёмныя творы або часткі твораў у аб'ёме, апраўданым адукацыйнай мэтай, без дадатковага дагавора з аўтарам, — дадала Ірына Старавойтава.

У ходзе ўчарашняга пасяджэння трэцяй сесіі Савета Рэспублікі шостага склікання быў разгледжаны шэраг законапраектаў аб ратыфікацыі міжнародных пагадненняў з Егіптам, Грузіяй, Суданам, Кыргызскай Рэспублікай, дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у законы аб крэдытных гісторыях, пра ветэранаў і іншыя — усяго 16 пытанняў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■

■ Педсавет

# УРОКІ ПРАЦЫ ЦІ ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА?

**Намеснік прэм'ер-міністра Васіль Жарко лічыць, што пытанням працоўнага выхавання ў старшых класах трэба ўдзяляць больш увагі. Такую думку ён выказаў падчас сумеснай нарады з удзелам міністра адукацыі Ігара Карпенкі, намесніка міністра фінансаў Юрыя Селіверстава і прадстаўнікоў органаў кіравання адукацыяй і ўстаноў адукацыі.**

— Нам неабходна павышаць якасць працоўнага навучання і выхавання ў школе. Такую задачу паставіў перад сістэмай адукацыі кіраўнік дзяржавы на Рэспубліканскім педагагічным савеце. Я лічу, што на сённяшні дзень працоўнае выхаванне страчана, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. — Тых навучальных гадзін у базавай школе, якія ёсць, відавочна недастаткова. Не кажучы ўжо пра 10—11-ы класы, дзе гадзіны на працоўнае навучанне наогул не прадугледжаны. У Кодэксе аб адукацыі таксама не прапісана працоўнае навучанне ў старшых класах. Гэтае пытанне трэба прадумаць. Што датычыцца зместу вучэбнага прадмета, то ён павінны быць максімальна практыкаарыентаваны і не адставаць ад жыцця.

Доўгі час пытаннямі працоўнага навучання займаліся міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты. Так, у 2000 годзе больш за 80% школьнікаў праходзілі прафесійную падрыхтоўку ў ВВК. Выпускнік атрымліваў кваліфікацыю рабочага, пасведчанне і меў магчымасць далей працаваць па прафесіі. На цяперашні момант у шэрагу рэгіёнаў міжшкольныя ВВК аптымізаваныя або рэарганізаваныя і перададзеныя ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дзе адкрыты аддзяленні дапрафесійнай і пачатковай прафесійнай падрыхтоўкі. А дзесьці яны проста закрыліся.

«Ці ўсё навучэнцы старшых класаў, якія гэтага жадаюць, маюць сёння магчымасці і ўмовы для атрымання пачатковай прафесійнай падрыхтоўкі? Ці дастаткова гадзін для атрымання прафесійных навыкаў на належным узроўні?» — пацікавіўся Васіль Жарко і дадаў, што каля 70 працэнтаў старшакласнікаў сёння працоўным навучаннем не ахоплены.

Міністэрствам адукацыі сумесна з Міністэрствам фінансаў і кіраўнікамі ўстаноў адукацыі будуць прапрацаваны пытанні арганізацыі працоўнага навучання і выхавання ў старшых класах і прыняты адпаведныя рашэнні. Для старшакласнікаў пашыраць магчымасці прафесійнай падрыхтоўкі па шэрагу прафесій. Для гэтага задзейнічаюць неабходныя рэсурсы, у тым ліку і базу прафесійна-тэхнічных устаноў.

У Міністэрстве адукацыі таксама лічаць неабходным узяць на асаблівы кантроль выкарыстанне гадзін грамадска карыснай працы для ажыццяўлення прафарыентацыйнай работы з вучнямі (з улікам рэальных магчымасцяў установы адукацыі, запытаў навучэнцаў, патрэбнасцяў рынку працы і запатрабаванасці прафесій).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

■ Я зноў выбіраю «Звязду»



Яўгенія АРЛЕАНСКАЯ, вядучы рэдактар студыі капірайтынгу Allwrite:

## «ЗВЯЗДА» ЗАСТАЕЦЦА ДЛЯ МЯНЕ ЎЗОРАМ

— Газета «Звязда» спачатку была для мяне проста вялікафарматным выданнем, сабраным у вялізныя падшыўкі. Але час ішоў, «Звязда» мянялася разам з ім. Гадоў шэсць таму ва ўніверсітэце мы, будучыя журналісты, сачылі за гэтымі зменамі з цікавасцю.

Так, змянілася вёрстка, на старонках стала больш «паветра», больш цікавых элементаў — гэта несумненны плюс. «Звязда» застаецца для мяне ўзорам таго, як трэба пісаць пра культурныя і спартыўныя падзеі.

Прыемна, што стагадовы «ветэран» айчыннага друку робіць насычаныя нестандартнай манерай матэрыялы. Цудоўна, што газета выкарыстоўвае ўсе змены, якія адбываюцца з ёй, сабе на карысць. І не адмаўляецца ад галоўнай сваёй адметнасці: беларускай мовы ■

# Мінск стане пляцоўкай. Маштабнай і прэзентацыйнай

## Паводле ацэнкі экспертаў, у такім мерапрыемстве, як II Еўрапейскія гульні, будзе ўдзельнічаць каля 100 тысяч чалавек

**Самым галоўным адрозненнем нашых гульняў ад першых у Баку будзе набор прадстаўленых відаў спорту. Акрамя таго, многія спаборніцтвы стануць кваліфікацыйнымі да Алімпійскіх гульняў 2020 года, а гэта значыць, што ў Мінску гарантавана збяруцца наймацнейшыя спартсмены з усёй Еўропы.**

У новым фармаце будзе прадстаўлена лёгкая атлетыка, па сутнасці, менавіта ў Беларусі ўпершыню прэзентуюць тую новую праграму, над якой зараз працуе Еўрапейская федэрацыя лёгкай атлетыкі. Чакаецца, што турнір стане камандным, а сам від спорту — яшчэ больш дынамічным і цікавым. На цяперашні момант ідзе абмеркаванне на тэму, колькі камандаў прыме ўдзел у турніры па лёгкай атлетыцы на Еўрапейскіх гульнях — 24 або 30.

У сувязі з такой маштабнай падзеяй змены чакае і сам наш горад. Мінск павінен стаць яшчэ больш камфортным і гатовым да наплыву гасцей. Дарожная інфраструктура, якая існуе сёння, знаходзіцца ў аптымальным стане. *«Дзесьці толькі неабходна будзе абнавіць гарадскі транспарт,* — адзначае **Сяргей ФУРМАНАЎ, начальнік упраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама.** — *Паспрабуем не толькі стварыць камфортныя ўмовы для гасцей горада, удзельнікаў спаборніцтваў, але і мінімізаваць усе нязручнасці, якія могуць паўстаць для мінчан у сувязі з вялікім патокам турыстаў».*

**Намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ** таксама адзначыў, што арганізатары пастараюцца зрабіць усё для таго, каб пасля правядзення Еўрагульняў пакінуць у горадзе спадчыну, якая палепшыць гарадское жыццё.




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Нагадаем, што па-ранейшаму працягваецца конкурс на распрацоўку талісмана топ-турніру. Як адзначаюць у Міністэрстве інфармацыі, кожны дзень паступаюць дзясяткі прапаноў з розных рэгіёнаў краіны. *«Па колькасці дасланых работ сёння лідзіруе Брэст, але сітуацыя мяняецца вельмі хутка»,* — адзначае **Уладзімір РАБАВОЛАЎ, начальнік упраўлення электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў Мінінфарма.** Ён падкрэслівае, што паступіла ўжо каля дзвюх соцень малюнкаў, да конкурсу падключаюцца грамадскія арганізацыі, навучальныя ўстановы, прымаюць удзел творчыя работнікі і прафесійныя мастакі.

Таксама працягваецца конкурс і на выбар галоўнай песні II Еўрапейскіх гульняў, заяўкі прымаюцца ў Міністэрстве культуры. *«Звычайная кампазіцыя, якая перамагае, становіцца асноўнай мелодыяй мерапрыемства,ператвараецца ў хіт не толькі ў Еўропе, але і ў свеце, таму гэта выдатны шанц заявіць пра сябе і ў музычным плане, бо трансляцыі Еўрапейскіх гульняў убачаць жыхары не менш чым 160 краін»,* — заявіў Анатоль Котаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Вечныя каштоўнасці

# Агонь, каравай і галінка яблыні

## Учора ў сталіцы выбралі Сям'ю года

**Рэспубліканскі конкурс на самую лепшую сям'ю трэці раз прайшоў у Беларусі. На фінальнае выступленне прыехалі выбраннікі журы ад кожнага рэгіёна, а таксама пераможцы Мінскага гарадскога адборачнага этапу.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Першая частка знаёмства з конкурсантамі называлася «Радавод». Другая частка выступленняў «Мая краіна — мая сям'я» прэзентавала прысутным захапленні і жыццёвую пазіцыю ўдзельнікаў. Перад пачаткам выступленняў удзельнікаў ад імя ўрада павітаў **намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ:**

— У бацькоўскім доме закладваюцца асновы, на якіх потым грунтуецца ўстойлівасць дзяржавы. У нас існуюць праграмы падтрымкі маладых, шматдзетных сем'яў, выплаты сем'ям, у якіх нараджаецца трэцяе дзіця, і дэкрэтны водпуск для маці. Хацелася б падзякаваць сям'ям — за іх штогадовую працу, і арганізатарам конкурсу — за магчымасць убачыць яе вынік.

Трэба сказаць, удзельнікі змаглі знайсці ў гісторыі свайго роду характэрныя толькі для іх адметнасці, бо кожнае выступленне мела свой сімвал і настрой.

Напрыклад, сям'я Хвясюк з горада Мікашэвічы Брэсцкай вобласці захоўвае традыцыі продкаў-палешукоў. Рыгор — сапраўдны гаспадар, умее і травы накасіць, і каня запрэгчы. У хатніх справах дапамагаюць яму жонка Марына, сын Артур і дачушкі Міхаліна і Злаціслава. Пад стук кроснаў сямейнікі расказалі гісторыю роду. Ад дзядоў, якія апрацоўвалі вялікі зямельны надзел, мужчыны ўзялі цярплівасць і працавітасць. Дзяўчаты падхапілі за бабулямі ўменне ткаць і вышываць, а яшчэ спяваць — звонка, на ўвесь голас.

Любімыя заняткі віцяблян Алега і Алены Краўчукоў — разам з дзецьмі выпраўляцца ў падарожжа або сабрацца вечарам за настольнай гульнёй. І бацькі, і дзеці ведаюць замежныя мовы, кожны гатовы разам са сваякамі выправіцца ў вандроўку — хоць на машыне па Беларусі, хоць у парк пакатацца на роліках. Пра гэта з жартамі, песнямі і танцамі яны і расказалі на сцэне.

Галінку яблыні як сімвал сувязі з мінулым і сучаснага росквіту ўзяла сабе сям'я Сідар з аграгарадка Лунна Мастоўскага раёна. Дзяўчаткі-весялушкі Марыя і Дар'я расказалі, як тата ездзіў на трактары на спатканне да мамы. Сужэнцы Алег і Ірына кранальна расказалі, што яблыня здаўна была для іх сям'і ўвасабленнем роду, дзе асобныя галіны ўтвараюць адно магутнае дрэва.

З легенды пачалося і выступленне жыхароў Нясвіжа Ігара і Святланы Яўтух *(на фота)*. Перад гледачамі паўстала сапраўднае тэатральнае дзейства, дзе гісторыя асобнай сям'і перапляталася з гісторыяй краіны. Знайшлося там месца і для прадзедавага пярсцёнка, і для бабуліных фотаздымкаў.

Сімвалічнымі атрымаліся выступленні сем'яў Войцех і Сокал. Для мінчан Алены, Сяргея, Веранікі, Максіма і Васілісы няма нічога важнейшага за цяпло сямейнага ачага. Кожная іскра — памяць пра продкаў, кожнае імгненне разам — цяпло ў сэрцы. Нашчадкі Сокалаў з Глуска перавілі выступленне параўнаннем чалавечага жыцця з зернем, коласам і — як вынік плённай працы і любові — абрадавым сямейным караваем.

Дарэчы, вялікая, шматдзетная сям'я — асаблівасць не толькі сёлетніх канкурсантаў. Продкі сужэнцаў Аляксандра і Наталлі Пятрушкаў, што жывуць у Калінкавічах, заўсёды мелі многа дзяцей. Пара таксама не адыходзіць ад традыцый і выхоўвае двух хлопчыкаў і чатырох дзяўчатак.

Сям'ю Пятрушкаў журы на чале з **міністрам працы і сацыяльнай абароны Ірынай КАСЦЕВІЧ** і ўганаравала першым месцам і званнем Сям'і года. Другое месца занялі мінчане — сям'я Войцех, а трэцяе месца павязе на радзіму сям'я Хвясюк з Мікашэвічаў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by* ■

**Больш фота на сайце www.zviazda.by**

■ Грошы

# ХУТКІ СТАРТ

## Больш за 10 млн па адрасным субсідаванні

**За апошні час Беларусбанк заключыў 246 дагавораў па праграме жыллёвага будаўніцтва з адрасным субсідаваннем на суму больш чым 10 млн рублёў. Пры гэтым шматдзетныя сем'і складаюць 97% у агульнай колькасці тых, хто звярнуўся ў банк. Самымі актыўнымі ўдзельнікамі праграмы з'яўляюцца жыхары Брэсцкага рэгіёна — там заключана 209 крэдытных дагавораў на суму больш за 9 млн рублёў.**

«Нягледзячы на непрацяглы тэрмін рэалізацыі Указа Прэзідэнта Беларусі №240, можна ўпэўнена гаварыць аб тым, што ён паспяхова функцыянуе,— адзначыла **намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Святлана КАЖЭКІНА.** — Ахоплены ўсе рэгіёны краіны. Хуткі старт паслужыў падставай для павелічэння аб'ёмаў крэдытавання дзяржаўнай праграмы жыллёвага будаўніцтва з адрасным субсідаваннем».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# ПАД ЗНАКАМ САВЫ

## Хто ў адказе за нашу бяспеку?

**Гэтая ўстанова размешчана на месцы былога ракетнага дывізіёна і займае плошчу большую, чым тысяча футбольных палёў. У сваю чаргу служба, да якой яна адносіцца, бярэ пачатак з пасады вартаўніка, а ў якасці талісмана абрала агульнапрызнаны сімвал мудрасці, які ў гэтым кантэксце атаясамліваецца з «нядрэмным вокам». На таямнічую загадку — просты адказ: размова пойдзе аб Дэпартаменце аховы, у супрацоўнікаў якога на эмблеме — сава.**

### ПАХНУЧЫ БАНК І ДОМ БЕЗ ДАХУ

А вось аб прызначэнні апісанага месца здагадацца значна больш складана. На самай справе такімі вялікімі памерамі і багатай перадгісторыяй валодае Цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы МУС, ці ва ўжытку проста «Гарані» — па месцы размяшчэння непадалёк ад Мінска. У найбліжэйшай будучыні ён будзе пераўтвораны ў аб'яднаны вучэбны цэнтр Міністэрства ўнутраных спраў, таму зараз на тэрыторыі актыўна вядзецца будаўніцтва. Мы ж паспелі наведаць установу адукацыі яшчэ пакуль яна знаходзіцца ў ведамстве Дэпартамента аховы, якраз напярэдадні 65-гадовага юбілею з моманту заснавання службы.

Пачынаем «экскурсію» з палігона стэндавай стральбы — іх у краіне ўсяго тры. На гэтым можна праводзіць нават чэмпіянат свету, ён абсталяваны па ўсіх міжнародных стандартах. Дарэчы, менавіта тут апошнія два гады праходзілі ведамасныя спаборніцтвы. Плануецца, што да 2022 года групы затрымання цалкам пяройдуць на выкарыстанне помпавых стрэльбаў — на палігоне для вучобы іх выкарыстоўваюць ужо зараз. Гэта больш гуманны від зброі, які дазваляе затрымаць злачынца, нанёсшы яму мінімальныя пашкоджанні.

Паблізу знаходзіцца аўтадром. На ім праходзяць падрыхтоўку не толькі навучэнцы цэнтра, такая магчымасць ёсць у любога, хто жадае здаць на правы катэгорыі B, праўда, заняткі будуць у межах праграмы іншых аўташкол. А вось складаныя манеўры і нават контраварыйнае кіраванне — гэта ўжо для прафесіяналаў.

Накіроўваемся далей: па дарозе былое ваеннае збудаванне, якое цяпер пераабсталявана пад навучальны аб'ект.

— Суворaў казаў, «вучыць трэба таму, што неабходна ў баі». У нас няма баёў, затое ёсць паўсядзённае выкананне задач ва ўмовах рэальнага жыцця. Вось тут яны якраз максімальна набліжаны да гарадскіх, — расказвае **начальнік Дэпартамента аховы МУС, генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА.**



І сапраўды, у адным памяшканні сканцэнтраваны магазін, банк, прыпынак грамадскага транспарту — месцы, патэнцыйна «прывабныя» для правапарушальнікаў. Дарэчы, кожнае з іх мае тут свой тыповы, практычна неадрозны для чалавечага нюху пах. Гэта важны элемент трэніроўкі для чатырохногіх абаронцаў правапарадку — нам яшчэ давядзецца ўбачыць іх у справе.

А зараз назіраем за зладжанымі дзеяннямі навучэнцаў цэнтра. Гэтакая сур'ёзная гульня ў рэчаіснасць: экіпаж садзіцца ў аўтамабіль, атрымлівае ўводную ад выкладчыка і выконвае неабходныя дзеянні гэтак жа, як калі б тут знаходзіўся сапраўдны злачынец. Для адпрацоўкі навыкаў нават пабудаваны паўнавартасны дом, які адрозніваецца ад звыклых нам дач хіба толькі тым, што ў яго няма даху. Гэта зроблена для таго, каб са спецыяльнай пляцоўкі можна было назіраць за дзеяннямі курсантаў, ацэньваць іх і рабіць высновы. У нейкі момант нават ловіш сябе на думцы, што глядзіш кіно: настолькі праўдападобна і ў той жа час сюррэалістычна выглядае ў гэтых умовах затрыманне злачынца.

### ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ... ДЛЯ САБАК

На чарзе — тая самая доўгачаканая сустрэча з нашчадкамі серыяльных Рэкса і Мухтара: паказальнае выступленне кіналагічнай службы.

— Зараз пры навучальным цэнтры ўтрымліваецца 29 сабак, у будучыні іх колькасць збіраюцца павялічыць да 40. У гадавальніку ўзвялі новы гаспадарчы блок, таму стала магчыма правядзенне племянной работы і ветэрынарнае абслугоўванне, за выключэннем хіба што складаных аперацый, — адзначыў **першы намеснік начальніка Цэнтра павышэння кваліфікацыі, начальнік вучэбнага аддзела палкоўнік міліцыі Сяргей ГРЫБАНАЎ.**

Усяго ў Дэпартаменце аховы служыць некалькі сотняў сабак. Аснову складаюць нямецкія аўчаркі, але таксама сустракаюцца бельгійскія і сярэднеазіяцкія аўчаркі і ратвейлеры. Яны, таксама як і курсанты, праходзяць пачатковую падрыхтоўку, а потым перыядычна зноў трапляюць сюды для павышэння кваліфікацыі. Новы вучэбна-лабараторны комплекс прадугледжвае работу кінолагаў у натуральных умовах, таксама ў праграме навучання — правядзенне следавой работы, выбарка чалавека, парадак дагляду аўтамабіляў.


Заняткі кіналагічнай службы.

Дарэчы, аб аўтамабілях. У рабоце самога дэпартамента актыўна выкарыстоўваюцца машыны беларускай вытворчасці.

Зазірнуўшы ў аўтамабілі, якія прызначаны для груп затрымання, разумееш, што фантастычная будучыня ўжо стала рэальнасцю: абсталяванне нагадвае карцінкі з фільмаў пра спецагентаў. Зараз яно праходзіць доследную эксплуатацыю.

Сігналы трывогі ад ахоўных аб'ектаў у рэжыме рэальнага часу паступаюць не толькі на пульт цэнтралізаванага назірання, але і на планшэты ў аўтамабілі. Гэтыя гаджэты дапамагаюць прасачыць размяшчэнне нарадаў, якія патрулююць горад, і вызначыць, які з іх найхутчэй дабярэцца да патрэбнага месца. Яму пракладваецца самы кароткі маршрут, на планшэце таксама можна паглядзець пад'езды да будынка, схему размяшчэння тэхнічных сродкаў аховы і памяшканняў унутры дома, па фота пераканацца, што гэта менавіта той аб'ект.

Падчас устаноўкі ахоўнай сістэмы на аб'екце галоўным з'яўляецца прынцып шматрубежнасці. Першы ўзровень — абараняюцца аконныя праёмы і дзверы з выкарыстаннем магніта-кантактных і оптыка-электронных апавяшчальнікаў, датчыкаў разбітага шкла. Другі — аб'ём памяшкання абсталёўваецца апавяшчальнікамі, якія рэагуюць на рух чалавека. Акрамя таго, пры неабходнасці можна ўстанавіць кнопкі трывожнай сігналізацыі. І многае іншае...


Адпрацоўка затрымання злачынца ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальнасці.

За працэсам работы службы можна паназіраць і ў навучальным класе: тут абсталяваны паўнавартасныя месцы дзяжурнага аператыўна-дзяжурнай службы і дзяжурнага пульта цэнтралізаванага назірання. У ролі аб'ектаў выступаюць падрабязныя макеты, на якіх не проста ўмоўна пазначаны будынкі, але можна разгледзець размяшчэнне адносна дарогі і іншых збудаванняў, колькасць вокнаў і дзвярэй і гэтак далей.

Пасля пранікнення зламыснікаў на ахоўны аб'ект сігнал паступае на пульт ў сярэднім за 15 секундаў, на працягу наступных 15 секундаў дзяжурны выдае інфармацыю ў эфір з указаннем дакладнага адраса. Дзяжурны таксама перадае інфармацыю пра колькасць памяшканняў, наяўнасць склепа і гарышча, гаража. У залежнасці ад прызначэння аб'екта вызначаецца колькасць выбываючых экіпажаў, калі гэта, напрыклад, банк, іх павінна быць мінімум два.

### І СПОРТ, І ТВОРЧАСЦЬ, І ДУХОЎНАСЦЬ

Першапачатковае навучанне доўжыцца 4,5 месяца. Набіраюць адну групу ў месяц, колькасцю да 90 чалавек. Цяпер у цэнтры навучаецца 541 чалавек, плюс праходзяць перападрыхтоўку дзесяць міліцыянераў-вадзіцеляў. Дарэчы, на курсы павышэння кваліфікацыі ўсе супрацоўнікі дэпартамента накіроўваюцца не радзей, чым раз у пяць гадоў.

Што датычыцца пачатковай падрыхтоўкі, то за гэты час курсанты па адзінай праграме вывучаюць асновы парадку нясення службы і праходзяць стажыроўку. Па словах начальніка дэпартамента, больш за 90% тых, хто праходзіць навучанне, — гэта людзі пасля арміі, з вышэйшай адукацыяй або з высокімі дасягненнямі ў спорце. Гэта значыць, досыць сталыя, матываваныя і з добрай рэпутацыяй: наяўнасць нават самых нязначных адміністрацыйных правапарушэнняў — адна з прычын адмовы для нясення службы ў дэпартаменце.

На працягу амаль пяці месяцаў курсанты жывуць на тэрыторыі цэнтра, таму з 40 аб'ектаў тут — 22 жылыя. Маладыя людзі жывуць у памяшканнях на 120 чалавек, якія прынята называць размяшчэннем, а не казармай. Для дзяўчат, якіх пакуль менш за 5% ад агульнай колькасці навучэнцаў, прапаноўваюцца пакоі гасцінічнага тыпу на 4—6 чалавек.

За час навучання курсанты паспяваюць абжыцца ў цэнтры ледзь не як дома. І не дзіва, бо абстаноўка гэтаму спрыяе: напрыклад, у сталовай яны па чарзе абслугоўваюць адзін аднаго самі. А вось на кухні «чаруюць» прафесійныя кухары. Праявіць свае таленты ёсць шанц у іншым. Курсанты сваімі рукамі ствараюць вулічныя дэкаратыўныя кампазіцыі, а таксама размалёўваюць не горш, чым прафесійныя мастакі, некаторыя службовыя будынкі. Для тых, хто не можа ўявіць свайго жыцця без спорту, уладкаваны стадыён на 750 месцаў, які абсталяваны бегавой дарожкай, а таксама пляцоўкамі для гульні ў футбол, валейбол, баскетбол.

Ёсць магчымасць падумаць і пра духоўнае. На тэрыторыі цэнтра знаходзіцца храм, асвячоны ў гонар велікамучаніка Георгія Перамаганоса. Частка ўнутранага ўбрання храма — душэўныя падарункі ад абласных упраўленняў дэпартамента. Побач з храмам — алея маладых дрэў, якая была высаджана ў маі гэтага года прадстаўнікамі краін — удзельніц СНД падчас семінара-нарады па абмене вопытам у ахоўнай дзейнасці.

А беларускім спецыялістам сапраўды ёсць што расказаць. Дэпартамент ахоўвае больш за 208 тысяч аб'ектаў па ўсёй краіне: ад дач да консульстваў і буйных гісторыка-культурных комплексаў. Акрамя таго, спецыяльны аддзел міліцыі дэпартамента забяспечвае суправаджэнне грузаў і транспартных сродкаў, ажыццяўляе асабістую ахову фізічных асоб. Толькі аўтамабіляў з рознымі відамі тавараў канваіруюць штогод звыш 11 тысяч.

А вось і яшчэ больш уражальная лічба: за дзевяць месяцаў гэтага года нарады груп затрымання Дэпартамента аховы звыш 453 тысяч разоў прыбывалі да месцаў злачынстваў і здарэнняў. А пачыналася ўсё з простых вартоўняў...

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Лепшае

# Агульны стаж — тры стагоддзі

## РАЗАМ НА СЛУЖБЕ І ДОМА

**У Віцебску адбыўся фінал рэспубліканскага конкурсу Міністэрства ўнутраных спраў «Сям'я! Служым разам!» На ім шанавалі пераможцаў абласных конкурсаў — 14 сямейных пар з усіх абласцей краіны. Як падлічылі арганізатары, агульны стаж службы фіналістаў — больш за 300 гадоў.**



На мерапрыемстве ў канцэртнай зале «Віцебск», дзе, дарэчы, праводзіцца дзіцячы конкурс фестывалю «Славянскі базар», было цікава. Перад пачаткам афіцыйнай цырымоніі свае майстэрства прадэманстравалі кінолагі Дэпартамента аховы. Можна было ўбачыць рэтра-аўто, якія калісьці выкарыстоўваліся для службовых задач. Шмат ахвотных было сфатаграфавацца з супрацоўнікамі ў форме паслярэвалюцыйных часоў, савецкага ўзору.

Адбыліся прэзентацыі малюнкаў дзяцей удзельнікаў конкурсу і насценных газет, прысвечаных выправаванням абласных этапаў. Сем'ям, каб трапіць у фінал, у ліку іншага, трэба было зрабіць відэапрэзентацыю.



У пачатку ганаровай часткі падзеі **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Аляксандр КОБРУСЕЎ** падкрэсліў, што сем'і-фіналісты — гонар МУС. З іх можна браць прыклад. Яны вядуць здаровы лад жыцця, удзельнічаюць у спартыўных, патрыятычных і выхаваўчых акцыях.

Павіншавалі фіналістаў і **начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Іван КУБРАКОЎ, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый.**

Сярод тых, хто атрымаў падзякі ад кіраўніцтва МУС, дыпломы, памятныя падарункі — сям'я Вараб'ёвых. Падпалкоўнік Ігар Станіслававіч і старшы лейтэнант Марыя Іосіфаўна служаць у віцебскай вайсковай часці 5524 унутраных войскаў, 20 і 9 гадоў адпаведна. Гадуюць 15-гадовую дачку Карыну і 13-гадовага сына Аляксея. Дзеці вучацца ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы, марацць таксама служыць у праваахоўных органах. Такім чынам, можа з'явіцца сапраўдная дынастыя. Муж і жонка ўжо тройчы раз бралі ўдзел у конкурсе, а ў фінал выйшлі ўпершыню.

Безумоўна, такія акцыі — добры ўклад у папулярызацыю службы ў органах унутраных спраў і ўнутраных войсках МУС. Штогод усё больш тых, хто хоча прысвяціць сябе ахове правапарадку. І, канешне, цудоўна, калі ствараюцца сем'і! Каханне, узаемаразуменне — гарантыя шчаслівага сямейнага жыцця.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Нарада

# Падазроных у цяжкіх злачынствах выяўляюць за суткі

## У сталіцы прайшла калегія Міністэрства ўнутраных спраў

**На парадку дня шырокае кола пытанняў: ад эфектыўнасці работы асобных падраздзяленняў да па-ранейшаму актуальнай прафілактыкі, у прыватнасці, якая датычыцца прадухілення гвалту ў сям'і.**

Адна з тэм — рэгістрацыйна-ўліковая дысцыпліна ў органах унутраных спраў. Гэтаму пытанню ўдзяляецца прынцыповая ўвага, паколькі ад дакладнага выканання заканадаўства аб прыёме, рэгістрацыі і разглядзе заяў грамадзян залежыць магчымасць хуткага раскрыцця злачынстваў і выкрыцця асоб, якія ўчынілі супрацьпраўныя дзеянні.

На пасяджэнні таксама абмяркоўвалася эфектыўнасць работы аператыўна-дзяжурных службаў органаў унутраных спраў. Толькі за першыя дзевяць месяцаў гэтага года супрацоўнікі АДС зрэагавалі на 1,2 млн заяў і паведамленняў, з якіх больш за 165 тысяч былі пра злачынствы. Пры гэтым выявіць падазраваных у пераважнай большасці выпадкаў удавалася на працягу дзяжурных сутак. Калі справа датычылася забойстваў — у 95% выпадкаў, наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў — у 98%, разбояў і рабаванняў — у 86%. Аднак, на думку кіраўніцтва ведамства, у дзейнасці службы ёсць недахопы, ліквідацыя якіх дапаможа ўдасканаліць яе работу.

Увагу ўдзялялі і тэме агульнай і індывідуальнай прафілактыкі правапарушэнняў, якая прадухіляе гвалт у сям'і. Па выніках дзевяці месяцаў бягучага года колькасць зарэгістраваных бытавых забойстваў у параўнанні з папярэднім перыядам знізілася на 8%, а наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў — амаль на 10%. У дачыненні да сямейных скандалістаў усё часцей прымяняюцца ахоўныя прадпісанні: іх колькасць узрасла з 2,2 тысяч да 3,9 тысяч. Усяго сёлета задакументавана больш за 37,5 тысячы адміністрацыйных правапарушэнняў, учыненых у побыце, такіх як дробнае хуліганства, абраза, прычыненне цялеснага пашкоджання, нанясенне пабояў, прычыненне болю, фізічных або псіхічных пакут і іншае

■ Духоўнасць

# СЛОВА ДА БОГА



## Пры ЛПП асвяцілі храм

**Гісторый, калі людзі, якія перажываюць крызісныя моманты ў жыцці, звяртаюцца да Бога, не мала. Распаўсюджана гэтая з'ява і сярод тых, хто знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі — сама абстаноўка спрыяе таму, каб пераасэнсаваць свае ўчынкі. Цяпер магчымасць памаліцца ў паўнавартасным храме ёсць і ў тых, хто ўтрымліваецца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі №3, што на Случчыне.**



Паколькі ў ЛПП трапляюць тыя, хто пакутуе ад алкагольнай залежнасці, месца пад будаўніцтва храма было асвечана ў гонар пакутніка Ваніфацыя — нябеснага заступніка цвярозасці. Адбылася гэта падзея яшчэ ў 2005 годзе, з таго часу ішоў збор ахвяраванняў на ўзвядзенне трывалага і прыгожага збудавання. Збіралі сродкі ўсёй грамадой: не засталіся ў баку і грамадзяне, якія ўтрымліваюцца ў ЛПП, супрацоўнікі ўстановы, іх калегі з крымінальна-выканаўчай сістэмы. Так, напрыклад, дах храма з'явіўся стараннямі кіраўніцтва дзяржаўнага прадпрыемства «Чатырнаццаць», якое размешчана ў вёсцы Навасады Барысаўскага раёна: яно перадало неабходныя бляшаныя лісты.

Атрымалася завяршыць будаўніцтва пасля таго, як летась ЛПП у Паўлаўцы ўзначаліла **падпалкоўнік унутранай службы Алеся ГОРБЕЛЬ.** Яна з імпэтам узялася за справу і матывавала асабовы склад зрабіць усё магчымае, каб дзверы храма расчыніліся ў найбліжэйшы час.

– Да гэтага я служыла ў жаночай калоніі ў Гомелі, дзе якраз пачалося будаўніцтва храма. І гэта каласальная праца! А ў Паўлаўцы будынак быў ужо гатовы, заставалася толькі ўнутранае аздабленне і ўбранне. Тут праводзілі некаторыя абрады, напрыклад, асвячалі велікодныя дары, але літургію не служылі, бо не было неабходных атрыбутаў, – адзначала начальнік прафілакторыя.

У выніку першага кастрычніка епіскап Слуцкі і Салігорскі Антоній правёў абрад асвячэння храма і адслужыў першую літургію. На ўрачыстай падзеі прысутнічалі намеснік начальніка дэпартамента выканання пакаранняў МУС палкоўнік унутранай службы Уладзіслаў Мандрык, намеснік начальніка ўпраўлення гэтага ж дэпартамента МУС па Мінску і Мінскай вобласці падпалкоўнік унутранай службы Ігар Гаеўскі, намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама Ларыса Дабравольская, а таксама святары, супрацоўнікі ўстановы і члены іх сем'яў і, канешне ж, тыя, для каго храм быў пабудаваны ў першую чаргу — жанчыны, якія ўтрымліваюцца ў ЛПП.

– Храм адкрыты штодня дзве гадзіны раніцай і дзве гадзіны ўвечары, каб яго маглі наведаць тыя, хто працуе і ў першую, і ў другую змену. У дні вялікіх рэлігійных свят служыцца літургія, апошняя адбылася на Пакроў Прасвятой Багародзіцы. У памінальную суботу пройдзе паніхіда, – расказала Алеся Горбель.

Так што асвячэнне храма — не адзіны крок у падтрымку вернікаў: кіраўніцтва прафілакторыя плануе і надалей супрацоўнічаць з прадстаўнікамі Слуцкай епархіі, каб несці тым, каму гэта так неабходна, духоўную асвету.

**Фота Алеся ДАСТАНКА, Яўгена ГАНУША**

■ На дарозе

# За няпамятлівасць не пакараюць

## Якія магчымыя змены КаАП закрануць кіроўцаў

**Парламент разглядае законапраект з прапановай Міністэрства ўнутраных спраў перапрацаваць шэраг артыкулаў Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. У прыватнасці, змены закрануць і вадзіцеляў: пакаранне за некаторыя віды парушэнняў правілаў дарожнага руху можа стаць менш суровым, а за іншыя — больш строгім.**

Так, забытыя дома дакументы больш не будуць прычынай атрымаць папярэджанне або заплаціць штраф памерам у дзве базавыя велічыні. Дадатковая адказнасць не настане і за паўторнае на працягу года перавышэнне хуткасці больш чым на 20 км/гадз. Але гэта не значыць, што парушальнік застанецца беспакараны: ён павінен будзе заплаціць належны штраф ад 5 да 15 базавых велічынь, але правоў не пазбавіцца. Штраф за адсутнасць страхоўкі ў выпадку аварыі можа скласці ад 5 да 10 базавых, у той час як цяпер лічба дакладная — 10 БВ.

Ёсць у законапраекце і пункты, якія заклікаты зрабіць адказнасць, наадварот, больш суровай. Так, прапануюць размежаваць пакаранне за перавышэнне хуткасці на 30 і больш кіламетраў у гадзіну. Пры перавышэнні ад 30 да 40 км/гадз. штраф застанецца ранейшы — ад 3 да 10 базавых, больш чым на 40 км/гадз. — штраф ужо ад 7 да 15 базавых велічынь.

Больш жорсткімі могуць стаць спагнанні і ў дачыненні да бяспраўнікаў за невыкананне патрабаванняў сігналаў рэгулявання, парушэнне правілаў перавозкі пасажыраў або іншых ПДР. Іх прапануюць караць таксама, як і кіроўцаў, якія стварылі аварыйную сітуацыю: штрафам ад 5 да 20 базавых велічынь з пазбаўленнем правоў на два гады альбо без пазбаўлення.

Аднак пакуль усе гэтыя пункты толькі частка законапраекта. Яшчэ не вядома, якія з іх увойдуць у канчатковую рэдакцыю. У парламенце спецыяльная група для абмеркавання прапаноў збярэцца ў лістападзе, пасля гэтага адбудзецца карэкціроўка законапраекта

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Векапомнае

# КАЗАЦЬ СТРАШНА, АЛЕ НЕАБХОДНА

**Беларускія архівісты апублікавалі новыя дакументы па знішчаных у гады вайны вёсках, а таксама першыя расказалі пра трагедыю населеных пунктаў Расіі**

**Уладзіміру Мілянцеву з Шаркаўшчыны не было і двух гадоў, калі карнікі палілі яго родную вёску Свілы. Згарэла ўсё дашчэнту: ніводнай гаспадарчай пабудовы не засталося. Мясцовым жыхарам пашанцавала — партызанская разведка папярэдзіла: ідуць гітлераўцы.**

Некалькі дзён людзі прасядзелі ў лесе, на балоце. Маленькі Уладзімір грэўся ў таткавых руках. «Праз тыдзень адна сям'я вырашыла паглядзець, што робіцца ў вёсцы, — расказвае жыхар спаленых Свілаў. — Як толькі яны ўвайшлі ў сваю хату — ззаду немцы. Сем чалавек згарэлі разам са сваёй хатай. Трое дзяцей, двое старых...»

Усяго ад рук карнікаў загінула 17 жыхароў вёскі. Тыя, хто насуперак холаду ды голаду засталіся ў лесе, разышліся па сваяках. Мілянцеві знайшлі прытулак у сваіх бацькоў у вёсцы Дубнікі. На папялішча вярнуліся толькі пасля вызвалення.

Больш чым 9200 вёсак зведала падобны лёс. Колькі бязвінных людзей загінула ў вогнішчы, па-зверску распаленым фашыстамі! Здаецца, пра сясцёр Хатыні, пра тыя населеныя пункты, якія адрадзіліся пасля вайны, ужо нямала расказана. Але шторaз у біяграфіі спаленых вёсак узнікаюць новыя факты. Асабліва, калі яшчэ жывыя сведкі тых бесчалавечных трагедый.

Многія з іх, на жаль, дагэтуль не маюць статусу ахвяр нацызму. Яны ніколі не атрымлівалі ніякіх кампенсацыйных выплат і не ўдзельнічалі ў гуманітарных праграмах. Але так было да нядаўняга часу. У межах міжнароднага праекта «Сацыяльная падтрымка людзям, якія выжылі ў спаленых беларускіх вёсках» больш як дзве тысячы беларусаў атрымалі матэрыяльную дапамогу ад берлінскага дабрачыннага аб'яднання «Кантакты».

— На жаль, сусветная грамадскасць не мае дакладнай інфармацыі аб знішчэнні беларускіх вёсак у гады Вялікай Айчыннай вайны, не ведае і аб такой катэгорыі ахвяр нацызму, як жыхары спаленых населеных пунктаў, — адзначае **каардынатар міжнароднага праекта «Сацыяльная падтрымка людзям, якія выжылі ў спаленых беларускіх вёсках» Наталля КІРЫЛАВА.** — Для большасці грамадзян сучаснай Германіі трагедыя беларускіх вёсак стала жудасным адкрыццём. Невыпадкова многія немцы захацелі аказаць матэрыяльную падтрымку тым, каму пашчасціла выратавацца.

Ужо каторы раз гісторыі спаленых беларускіх вёсак пераасэнсоўваюць і навукоўцы. Нашы архівісты выдалі ўжо не адзін зборнік дакументаў, успамінаў па праблематыцы. Але, відаць, кропка ў гэтым балючым для беларусаў пытанні яшчэ не пастаўлена — днямі ў Нацыянальным архіве Беларусі прэзентавалі адразу два зборнікі дакументаў і матэрыялаў «Спаленыя вёскі Беларусі. 1941—1944» і «Спаленыя вёскі Расіі. 1941—1944», у якіх падрабязна расказваецца аб нацысцкіх злачынствах, здзейсненых у гады вайны на тэрыторыі дзвюх нашых краін. Многія дакументы надрукаваны ўпершыню.

— Мы вяртаемся да тэмы, пра якую і казаць страшна, а не дай Бог перажыць тое, што зведалі жыхары спаленых вёсак, — перакананы **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Віктар КУРАШ.** — Але толькі так мы можам захаваць памяць аб тых жахах вайны, а таксама папярэдзіць чарговыя спробы перапісаць гісторыю, прынізіць ролю беларускага і рускага народаў у Вялікай Айчыннай вайне. Памяць чалавека настолькі кароткая, таму наша задача — зрабіць усё магчымае, каб чалавецтва не забылася, што такое фашызм.

Калі тэма спаленых вёсак у нашай краіне ўзнімаецца рэгулярна, то для расійскай гістарыяграфіі такое грунтоўнае даследаванне па спаленых вёсках на іх тэрыторыі зроблена ўпершыню. Прычым гэта датычыцца не толькі савецкага часу: ніхто не браўся за тэму і ў гісторыі сучаснай Расіі. Сімвалічна, што ўнікальны для нашых суседзяў зборнік дакументаў і матэрыялаў падрыхтавалі беларускія навукоўцы і архівісты.

Па словах **дырэктара Фонду садзейнічання актуальным гістарычным даследаванням «Гістарычная памяць» (Масква) Аляксандра ДЗЮКАВА,** у Расіі таксама праводзіліся карныя аперацыі, але ў савецкі час не вялося ніякай работы хоць бы па стварэнні спісаў спаленых вёсак. «Такі ўлік вядзецца ў Беларусі, ва Украіне, на базе якіх ствараюцца сучасныя базы, даступныя анлайн, — кажа ён. — У нас жа ніхто гэтым ніколі не займаўся. Карыстаючыся сваім вялізным вопытам даследавання трагічных старонак нашага мінулага, беларускія калегі падрыхтавалі такое грунтоўнае даследаванне. Выканалі тое, чаго не зрабілі мы».

Расійскія даследчыкі спадзяюцца, што калі-небудзь і ў іх краіне з'явіцца база даных спаленых вёсак. Што да найбліжэйшай перспектывы, то згаданы зборнік неўзабаве будзе прэзентаваны ў Маскве.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Лепш папярэдзіць

# УСЁ, ШТО ВЫ НЕ ВЕДАЛІ ПРА ІНСУЛЬТ

**Кожную шостую секунду ў свеце хто-небудзь гіне ад інсульту. У нашай краіне ў зоне рызыкі знаходзяцца каля 2 мільёнаў чалавек**

**Наогул, гэта не абавязкова людзі пажылыя, але і маладыя, у якіх інсульт можа быць абумоўлены нейкімі генетычнымі асаблівасцямі або, скажам, спартыўнай траўмай. Але ў большасці выпадкаў размова ідзе пра лад жыцця і звычку клапаціцца пра сваё здароўе. Сацыяльны праект «У адным вымярэнні» звяртае ўвагу кожнага беларуса на праблему інсультаў і інфарктаў. Ініцыятыва належыць швейцарскаму брэнду Microlife, які вырабляе танометры для маніторынгу ціску і выяўлення мігальнай арытміі.**



Звыш 32 тысяч беларусаў перанеслі летась інсульты. Не сакрэт, што захворванне нясе прамую пагрозу жыццю, і да нядаўняга часу 25 і болей пацыентаў з кожнай сотні гінулі ў выніку сасудзістай катастрофы. Большасць тых, што выжываюць, атрымліваюць інваліднасць і маюць патрэбу ў спецыяльным доглядзе. З павелічэннем працягласці жыцця захваральнасць будзе няўхільна расці, аднак намаганнямі сучаснай медыцыны за апошнія 10 гадоў смяротнасць ад інсульту ўжо ўдалося наблізіць да еўрапейскіх паказчыкаў. Сёння ў стацыянарах гіне каля 13 з сотні хворых з парушэннем мазгавога кровазвароту. Варта дадаць, што ўсіх такіх пацыентаў абавязкова дастаўляюць для атрымання неабходнай меддапамогі ў клінікі, дзе ёсць адпаведныя магчымасці для абследавання і лячэння.

**Галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Святлана ХАДАСЕВІЧ** падкрэслівае, што ў нас створана цэлая сістэма аказання неўралагічнай дапамогі — звыш 5,5 тысячы неўралагічных ложкаў у стацыянарах, працуе 1200 урачоў-неўролагаў. Акрамя таго, навыкамі неўролага валодае кожны ўрач агульнай практыкі. На выяўленне фактараў рызыкі, кантроль артэрыяльнага ціску скіравана дыспансерызацыя. Хуткая медыцынская дапамога мае дастатковае аснашчэнне. Прадугледжаны магчымасці дастаўкі пацыентаў у тыя арганізацыі аховы здароўя, дзе ёсць магчымасці для правядзення магнітна-рэзананснай і камп'ютарнай тамаграфіі галаўнога мозга. Для лячэння прымяняюцца трамбалітычная тэрапія, хірургічнае лячэнне і іншыя метады. Праануецца і рэабілітацыя.

На працягу шасці месяцаў праект «У адным вымярэнні» пройдзе ва ўсіх рэгіёнах краіны, а першай актыўнасцю стануць відэагісторыі вядомых беларусаў, якія сутыкаліся ў сваім жыцці з інсультам або інфарктам. Многія прызнанні прагучаць для шырокай аўдыторыі ўпершыню. На цэнтральных каналах можна будзе ўбачыць відэаролікі з удзелам заснавальніка партала TUT.BY Юрыя Зісера, гімнасткі Міліцыі Станюты, спявачкі Настассі Ціхановіч, спевака і тэлевядучага Георгія Калдуна, музычнага прадзюсара Макса Алейнікава, шоумена і тэлевядучага Андрэя Бонда і бізнесмена, стваральніка партала аб інсультах і інфарктах cardio.today Дзмітрыя Балашова.

— У рэгіёнах запланаваны сустрэчы з медыкамі і тэсціраванне танометраў новага пакалення, — тлумачыць **прадстаўнік брэнда «Мікралайф» Ганна АКУЛІЧ.** — Апараты абсталяваны ўнікальнай тэхналогіяй AFIB, якая дазваляе з імавернасцю 98 працэнтаў выявіць адну з прычын інсульту — мігальную арытмію. Мы раскажам малым і дарослым у рэгіёнах, як правільна мераць ціск, як папярэдзіць і распазнаць інсульт.

Афіцыйным партнёрам праекта стане партал «Здаровыя людзі». Тут можна будзе атрымліваць адказы на хвалюючыя пытанні па тэме. Можна адшукаць ролікі і інфармацыю аб тым, што рабіць да прыезду хуткай, да чаго быць гатовымі, калі нехта з блізкіх аказаўся ў рэанімацыі, як адбываецца рэабілітацыя. «Мала хто з нашых людзей разумее, што рабіць з інсультным пацыентам дома, — кажа **кіраўнік нацыянальнага партала аб ахове здароўя «Здаровыя людзі» Вольга СВЯТЛІЦКАЯ.** — Хворы чалавек не будзе бясконца знаходзіцца ў стацыянары, ён вернецца дадому і астатак жыцця правядзе ў сваёй сям'і, якая павінна быць гатовай да гэтага, ведаць, што ад яе патрабуецца. Аб усім гэтым мы і будзем гаварыць у рэгіёнах, куды накіруемся разам з «Мікралайфам».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## Як распазнаць?

**Галаўны мозг умоўна можна параўнаць са складанай камп'ютарнай сістэмай: які блок паламаўся, такую сімптаматыку можна і атрымаць. Інсульт можа праходзіць абсалютна па-рознаму: у аднаго будуць адны праявы, у другога іншыя. Тым не менш лічыцца, што ёсць найбольш распаўсюджаныя сімптомы, якія нельга пакідаць без увагі, — трэба тэрмінова выклікаць «хуткую»: гэта моцная слабасць, парушэнне маўлення, руху, каардынацыі.**

**Трывожнымі сігналамі лічацца наступныя:**

- ✓ вы папрасілі хворага ўсміхнуцца, але ўсмешка атрымалася «крывая», адзін бок вуснаў застаўся апушчаным уніз;
- ✓ вы папрасілі хворага падняць рукі ў становішчы седзячы на 90 градусаў або лежачы на 45 і затрымацца так на 5 секундаў, але яму гэта не ўдалося;
- ✓ вы папрасілі што-небудзь сказаць, але хворы пераствуляе словы, маўленне атрымліваецца нязвязанае.

Любая з гэтых прыкмет азначае неабходнасць выклікаць «хуткую». Сучасным метадам меддапамогі ў такіх выпадках лічыцца выкананне тромбалізісу. Звычайна тромб пад уздзеяннем прэпарату павінен рассмактацца, але здараецца такое не заўсёды. Ёсць, на жаль, пакуль выпадкі, калі медыцына бяссільная.

## Які ў вас ціск?

**За выключэннем рэдкіх выпадкаў інсульты абумоўлены некалькімі агульнымі прычынамі.**

1. **Артэрыяльная гіпертэнзія.** Ціск трэба мераць калі не штодня, то ў пэўнай ступені рэгулярна. Калі некалькі разоў вы атрымалі значэнні звыш 140/90 мм рт. сл. (замежныя даследчыкі, дарэчы, сцвярджаюць, што пачынаючы ўжо са 115/75 выяўляецца сувязь з рызыкай неспрыяльнага развіцця падзей), то варта весці размову пра паталогію, якую нельга пакідаць без кантролю. Пры павышаных лічбах, устаноўленым дыягназе не абысціся без медыкаментознай тэрапіі.

2. **Гіперхалестэрынемія.** Павышаны ўзровень халестэрыну прыводзіць да ўтварэння атэрасклератычных бляшак, якія ў сваю чаргу могуць прыводзіць да звужэння артэрый галаўнога мозга.

3. **Курэнне, алкаголь.** Вечныя ворагі здароўя.

4. **Гіпадынамія.** Вядома, што дэфіцыт руху вельмі шкодзіць сардэчна-сасудзістай сістэме.

5. **Узровень глюкозы.** Яе павышэнне прыводзіць да паталагічных змен у сасудах. Дарэчы, узровень глюкозы і халестэрыну можа адрозніваецца ў залежнасці ад таго, дзе і як вам праводзілі аналіз. Таму на ўсіх бланках аналізаў, якія вы атрымліваеце, напісаны нарматыўныя значэнні канкрэтна для дадзенай лабараторыі. Той жа ўзровень глюкозы для капілярнай або венознай крыві будзе пазначацца ў розных лічбах. Раней для ўзроўню глюкозы верхняй нормай лічылі 5,5 ммоль/л, цяпер гэта норма набліжаецца да 6.

6. **Мігальная арытмія.** Гэта парушэнне рытму сэрца, калі яно скарачаецца часцей, чым трэба — звыш 60—80 удараў за хвіліну — і хаатычна. Пры такой паталогіі не адбываецца адэкватнага забеспячэння крывёй перыферычных органаў і тканак. Акрамя таго, павышаецца рызыка тромбаўтварэння ў сэрцы: трамбы могуць з токам крыві трапіць у той жа галаўны мозг, што і абумовіць інсульт.

Гэтыя фактары рызыкі звычайна заяўляюць аб сабе ў больш пажылым узросце, аднак спецыялісты рэкамендуюць і маладым цікавіцца пералічанымі паказчыкамі. Калі вы самастойна здавалі аналізы, мералі ціск і выявілі штосьці далёкае ад нормы, неабходна ісці да ўчастковага ўрача або ўрача агульнай практыкі.

■ Простая мова

# ДАЖЫЦЬ ДА ВЯСНЫ

**Мабільнікі звіняць паўсюль і на ўсе галасы. З найбольш нечаканых у людных месцах — кукарэканне, плач немаўляці, беларускія «Тры чарапахі»,**
**«...А калі не спяваць аб радзіме» ды, магчыма...**
**Надоечы, вечарам, у трамваі загучала бадзёрае:**
**«А я ў печы не паліла, мілы мой міленькі, а я есці не варыла, голуб мой сівенькі...»**
**Некаму, трэба разумець, жонка званіла. Нагадвала, што вячэры няма? Ці папярэджвала, каб у краму зайшоў?**

## Каб зразумець...

Горад. Вуліца. Паток машын, але ж набліжэнне гэтай і чуваць, і відаць здалёку, бо яна — з сірэнай, з мігалкай — ляціць, як маланка: ратуе, відаць, нейчае жыццё...

Але ж вось кіроўца тармозіць (губляе час) — стараецца плаўна пераехаць так званага ляжачага паліцэйскага і не можа — хворага (ці ўжо ледзь жывога?) у «хуткай» добра падкідае...

Кажуць, гэтыя штучныя перашкоды на шляху машын сябе не апраўдалі, месцамі іх збіраюцца зносіць.

...Некага, як трэба разумець, падкінула?

Ці не давезла?

## Жыццё і анекдот

Новы дзень — новыя навіны. Альбо старыя — проста абставіны іншыя. На той раз у кватэру, больш падобную на прытон, сышлася кампанія, туды ж нехта з «дабрадзеяў» падагнаў біклагу з этылавым спіртам. Пачастунак скончыўся рэанімацыяй і ахвярамі.

Жыццё, карацей, як той анекдот.

Паводле яго, трое бамжоў даcталі буталь сумнеўнага спірту і адразу прылажыліся, ад чаго адзін знежывеў, прычым літаральна: памералі пульс — няма, наогул...

Двое другіх спужаліся, бо гэта ж не жартачкі — памёр чалавек. Яны не разумелі хіба, з-за чаго, бо пілі ж няшмат і нічога дрэннага: спірт у бутлі — і на пах, і на смак...

Каб пераканацца, яны зноў яго панюхалі, зноў пакаштавалі (зааднo — памянулі памерлага), пасля чаго нябожчыкаў... стала больш: і другі з мужчын, што называецца, ногі выцягнуў.

Трэці з кампаніі тады зусім расстроіўся: бачыў жа і дваіх нежывых, і астатак спірту. «А-а, — сказаў, была ні была: лепей пузу лопнуць, чым дабру прапасці». І выпіў.

...Анекдот як жыццё.

## «Если бы молодость знала...»

Раніцой па буднях ці не ўсё насельніцтва прыгарадных вёсак, гарадоў і мястэчак едзе ў Мінск — хто на працу, хто на вучобу... Бліжэй да вечара яно, тое ж насельніцтва, вяртаецца назад: сесці (бо стоячы не пачытаеш) у электрычцы няма дзе. Ці ўсё ж...

— Тут занята, — рассеўшыся Станіславай строга папярэджвае немаладая бландзінка.

— Усё? — удакладняю з надзеяй.

Пытанне ёй, відавочна, не падабаецца, бо змушае пасунуцца — адно месца вызваліць. Другое (насупраць) яна працягвае «трымаць» і, можна сказаць, да апошняга: перад самым адпраўленнем цягніка (бландзінка знервавалася) у вагон заходзіць яе чаканы — высокі, запыханы стары.

— Дзе ты быў? Дзе твой тэлефон? — усчынае допыт жанчына.

— Ды я... Ды ты..., — бездапаможна лапоча яе спадарожнік, выціраючы пот і здымаючы шапку, шалік...

— Ты б яшчэ кажух уздзеў, — аж зелянее ад злосці бландзінка. — На дварэ плюс 15!

— Мілая, дык я ж на працу табе званіў, — кажа ў апраўданне мужчына, — я пытаўся, што апрануць? Ты сказала: «Хоць што». Дык я во гэту куртку знайшоў...

Пад ёй, пуховай (мужчына памалу распранаўся) быў пінжак, пад пінжаком — світар, пад світарам — рубашка і нават з гальштукам...

— Ну як дзіця! Мазгоў зусім нямашака, — бог ведае каму расказвала бландзінка. — Абы як адзеўся, тэлефон не ўзяў, на поезд ледзьве паспеў... Можа, яшчэ і хлеб не купіў?

— Не, ну што ты, — узрадаваўся мужчына, — хлеба я набраў! Праўда, не той, што ты хацела (ён дастаў з кішэні цыдулку). Гэткага ў краме не было, быў таннейшы. Я тры булкі ўзяў...

— Навошта?! Мы што — сушыць яго будзем?! — ледзь не плакала жанчына.

— Мілая, ты злуешся. Я вінаваты. Кажы: што я зрабіў не так? — пытаў стары.

— Усё! — у роспачы кінула жонка, адвярнуўшыся да акна і даўшы зразумець, што на гэтым размова скончана.

...Далей яны ехалі моўчкі (хоць дзед — на твары было напісана — і хацеў бы пагутарыць): можа, крыўдавалі адно на аднаго, можа, успаміналі, якія былі шчаслівыя (ён — ажаніўшыся з маладзейшай — гадоў на 25, яна — выходзячы замуж за старэйшага, відаць, прыгожага і не беднага)...

А можа, думалі, што жыць ім было добра, а вось як дажываць...

## Чужыя беды — наша суцяшэнне

Старыя дамы-кварталы — старыя камунікацыі з усімі адсюль наступствамі ў выглядзе частых парываў, аварый ды адключэнняў вады. І гарачай бы паўбяды (прабачце за рыфму), — часам не бывае ніякай. А калі да гэтага зазімкам няма і цяпла...

— Для жыцця ну ніякіх умоў, — скарджуся знаёмым. І тыя згаджаюцца. Абрывае толькі адна:

— А як у турме? — пытае яна.

І сапраўды, як? З вадой ды ацяпленнем, магчыма, не горш. А з усім астатнім?

Суцяшае хіба адно — суд у нас справядлівы: як казаў нехта з гумарыстаў, калі не вінаваты, больш за тры гады не дадуць.

## Родныя? Розныя

Хата як хата была — звычайная, вясковая: два акенцы да вуліцы, ганак, калодзеж, сад... Сто разоў праязджай — вока не зачэпіцца, пакуль...

З год таму вокны-дзверы ў той хаце крыж-накрыж забілі. Гаспадары, значыць, у лепшым выпадку, з'ехалі, у горшым...

Выглядала якраз на тое, на горшае, бо вясной, праз паўгода, вакол сялібкі ўжо кіпела работа: ставіўся новы плот, у хаце мяняліся вокны (што здзівіла — у адной палавіне). Да яе ж затым прыбудаваўся... яшчэ адзін ганак — асобны, а побач — прыбіральня, яшчэ адна...

Трэба разумець, нашчадкі, родзічы, двое — уступілі ў спадчыну і зараз, падзяліўшы яе *«в равных долях»*, будуць карыстацца — кожны сваёй.

Яшчэ і прыбіральняй.

## Каза не казёл?

...Вядомы кінагерой прарочыў, што хутка не будзе нічога — ні кіно, ні тэатра, ні кніг, ні газет, — адно суцэльнае тэлебачанне.

І на ім, як часам здаецца, таксама не будзе — нічога (ну ці амаль...) апроч абрыдлай рэкламы. Ну можа яшчэ...

Адзін з каналаў рэгіянальнага вяшчання прымае заяўкі на віншаванні — з юбілеем, з вяселлем, з нараджэннем дзіцяці... І потым (трэба разумець, не бясплатна?) выконвае іх. Ну вось напрыклад. Экран тэлевізара, на ім «цаглінкаю» надпіс: «Віншаванне такой (далей — прозвішча, імя, імя па бацьку) альбо такому...» І буйным планам іх фота — асобна і разам з дзецьмі... З бацькамі, дома, на працы, на рыбалцы...

За імі, гэтымі кадрамі альбо паралельна, гучаць узнёслыя кампліменты ды пажаданні (у тым ліку непісьменныя, дрэнна зрыфмаваныя...), потым «праплывае» «мора кветак» і гучыць любімая песня (для жанчын, як правіла, з рэпертуару Стаса Міхайлава).

А дапаўняе гэту «карціну» бягучы радок: на экране (дапусцім) фота імянінніцы — на ганку нейкага крутога замежнага атэля (чатыры зоркі — гэта ж не абы што!), а ўнізе — прыватная абвестка аб тым, што прадаецца каза — белая, бязрогая, тэрмінова.

...За казла нехта, відаць, адказаў бы. А за казу — не?

## Прыклад

...Маленькая, худзенькая, бялявая гэта жанчына, відаць, да скону застанецца Кірачкай, хоць тым часам ужо бабуля.

Унучкі ў яе пацешныя. Дзве. Праўда, малодшую Кірачка рэдка бачыць, бо сын з нявесткай разведзены... Як і зяць з дачкой.

Што цікава, Кірачка з мужам таксама: гады са тры ўсяго пажыла, а потым...

Адна дзяцей гадавала. Былы яе хіба грошы прысылаў ды прыязджаў на вяселлі.

Віняўся тады перад Кірай і дзецьмі, казаў, што дурны быў, што не трэба было спяшацца разводзіцца, што ў новых шлюбах анічога лепшага не знайшоў, напрамілы бог прасіў маладых, каб не паўтаралі яго памылак.

Словы, падобна, сілы не мелі.

А вось учынкі...

## Дажыць да вясны

...Нейкі месяц таму маці, нягледзячы на свае хваробы, даглядала хворага бацьку. Рухавая была, часам нават вясёлая. А дагле́дзела — «спрадкавала», правяла ў апошні шлях, і як падмянілі: стала блытаць дні і таблеткі, забывацца есці і зачыняць комін, перастала пазнаваць людзей. «Яе нельга пакідаць адну», — пасля саракавін сказаў старэйшы з сыноў, і ўсе паглядзелі на малодшага: той жыў у найбольшай кватэры.

І сапраўды, месца для маці ў яго хапіла б, але...

Гэта нявестка ніколі не любіла свякроў, а свякроў — нявестку.

— Лепей я забяру, — сказала меншая з дачок, якую тут жа асеклі пытаннем: «Куды? Пятай — у двухпакаёўку?»

— Можна б да нас, — няcмела завяла тады большая, — але ж мой Васёк...

(Васёк яе, дарваўшыся да гарэлкі, зноўку ляжаў без памяці).

— А хай ва ўсіх пажыве, — выдаў зяць непітушчы.

— І праўда, — падтрымалі яго сямейнікі, — нас жа пяцёра. У кожнага па месяцы, а там, глядзіш, і вясна... І ў вёску можна... І добра ўсім.

«Так-так, добра, — гледзячы на дзяцей, думала маці. — За месяц нікога, дасць бог, не абцяжару, нікому не збрыдзею... Можа, і дажыву... Да вясны».

Надзея...

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■

■ Прававая гасцёўня

## Перш чым судзіцца ды дзяліцца,

### вырашыце пытанні праз шлюбны дагавор

***Мы з мужам не жывём тры гады, але афіцыйна шлюб не скасавалі. У нас трое дзетак. Дачка (23 гады) — інвалід І групы (сіндром Даўна), другая дачка (18 гадоў) і сын (10 гадоў). Маем дом, гаспадарчыя пабудовы, два гаражы, машыну.***

***У 2011-м збудавалі 2-пакаёвую кватэру, паколькі нам не хапала «квадратаў» на ўсю сям'ю з прыцягненнем крэдыту на 40 гадоў. У доме цяпер жыве муж (сярэдняя дачка там прапісаная, але жыве са мною). У кватэры прапісаны я, старэйшая дачка-інвалід і сын, якія жывуць са мной. Гэтая нерухомасць афармлена на мяне, і я штомесяц выплачваю за яе крэдыт. Збіраемся з мужам скасаваць шлюб і дзяліць маёмасць. Мяне цікавіць, ці будзе ўваходзіць у падзел маёмасці кватэра, дзе я жыву, і за якую плачу і яшчэ буду плаціць крэдыт?***

**Наталля ІВАНОВА,**
*Гомельская вобласць.*



На пытанне адказвае **Кацярына ПЯТРОВІЧ, член Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, адвакат адвакацкага бюро «Дубавец і партнёры»:**

— Згодна з артыкуламі 23 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, маёмасць, прыдбаная мужам і жонкай падчас шлюбу, з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю. Пры гэтым няма розніцы, на каго з сужэнцаў яна набыта (афармлена) або хто з іх уносіў за маёмасць грошы. Муж і жонка маюць роўныя правы валодання і распараджэння маёмасцю і, пры падзеле гэтай агульнай сумеснай уласнасці, долі сужэнцаў прызнаюцца роўнымі, калі іншае не прадугледжана шлюбным дагаворам.

Такім чынам, кватэра, пабудаваная і зарэгістраваная на праве ўласнасці за вамі ў 2011 годзе ў перыяд шлюбу будзе з'яўляцца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў і таксама падлягаць падзелу. Запазычанасць па крэдытным дагаворы, між іншым, вы таксама маеце права падзяліць з мужам.

Перш чым падаваць заяву на скасаванне шлюбу, раю вам з мужам заключыць шлюбны дагавор, дзе прапісаць усе пытанні, якія датычацца падзелу маёмасці. Акрамя таго, суд упраўе адступіць ад прызнання доляў роўнымі, улічваючы інтарэсы непаўналетніх дзяцей і недзеяздольных паўналетніх, якія маюць патрэбу ў дапамозе, або інтарэсы аднаго з сужэнцаў, якія заслугоўваюць увагі. Пры падзеле маёмасці судом улічваецца таксама агульныя долі мужа і жонкі і правы па абавязацельствах, якія ўзніклі ў інтарэсах сям'і.

*Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы*

■

■ Да ведама

## ДАІ ЗАКЛІКАЕ ЗАХОЎВАЦЬ ПРАВІЛЫ ПЕРАВОЗКІ ДЗЯЦЕЙ

**Адначасова з гэтым заклікам да бацькоў напярэдадні школьных канікулаў Дзяржаўтаінспекцыя ўзмоцніць кантроль за няўхільным выкананнем правілаў бяспечнай перавозкі дзяцей.**

«Адпраўляючыся ў паездку на аўтамабілі, не забывайце аб захаванні правілаў бяспекі пры перавозцы непаўналетніх пасажыраў. Дзіця да 12 гадоў павінна перавозіцца з выкарыстаннем спецыяльнага ўтрымліваючага прыстасавання, а дзяцей больш старэйшага ўзросту неабходна прышпільваць стандартным рэменем бяспекі.

За 9 месяцаў на дарогах краіны загінула 14 дзяцей, 207 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Сярод дзяцей, што атрымалі ў ДТЗ смяротныя траўмы — шэсць пасажыраў, сем пешаходаў, адзін веласіпедыст. Па віне кіроўцаў пацярпелі 148 з 221 дзіцяці (67 працэнтаў).

90 дзяцей атрымалі траўмы, з'яўляючыся пасажырамі транспартнага сродку. Пры гэтым 40 працэнтаў непаўналетніх перавозіліся без выкарыстання ўтрымліваючага ўстройства ці рэменя бяспекі.

Ужо ў кастрычніку загінулі тры дзіцяці, якія перавозіліся з парушэннем устаноўленых правілаў».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ Кінакрокі

# Марсэль МАЙГА: «Беларусь сваімі фільмамі не прарэкламавана за мяжой»

**Міжнародны кінафестываль у нямецкім горадзе Котбус, што робіць акцэнт на Усходняй Еўропе, сёлета паказаў спецыяльную праграму беларускага кіно. З той нагоды, што беларускія фільмы ў адзіночку, а тым больш серыямі рэдка трапляюць на еўрапейскія міжнародныя кінафорумы, паказ багатай котбускай падборкі «Special: Belarus» можна лічыць надзвычайнай падзеяй. Мы сустрэліся з Марсэлем Майга, што аглядзеў каля сотні створаных за апошнія гады беларускіх фільмаў, размеркаваў іх па некалькіх групах і сабраў цэлую праграму, што мусіць рэпрэзентаваць сучасны беларускі кінематограф. Дарэчы, большая частка яго выбару канцэнтруецца на маладых незалежных рэжысёрах, што здымаюць без вялікіх грошай і, магчыма, нават на аматарскім узроўні ці ў эксперыментальным кірунку, але ў той жа час ствараюць пэўны вобраз таго, што ў Беларусі хвалюе маладых людзей.**



***— Чаму Котбускі кінафестываль вырашыў стварыць праграму «Special: Belarus»?***

— Мы ўжо шмат гадоў думалі пра гэта, бо нашы веды пра беларускае кіно абмяжоўваліся класікай пра вайну і некаторымі рэдкімі карцінамі накшталт «Акупацыя. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі. На Котбускім кінафестывалі мы прадстаўляем усю Усходнюю Еўропу, але беларускія фільмы да нас амаль не даходзяць, я магу ўспомніць толькі дзіцячыя карціны, праўда, яны паказваліся даўно. Таму мы вырашылі прадставіць беларускую кінематаграфію інакш, паглядзець, што тут адбываецца ў ігравым і дакументальным кіно, наколькі розныя фільмы па жанрах і тэмах у ёй з'яўляюцца. Не можа ж быць, каб Беларусь не была ўключана ў кінапрацэс. Мы супрацоўнічаем з мінскім кінафестывалем «Лістапад», але, на жаль, ён праходзіць адначасова з котбускім, і мы не можам прыехаць у Мінск, каб паглядзець свежыя беларускія фільмы. Таму для стварэння «Special: Belarus» нам спатрэбілася шмат часу.

***— Як вы шукалі і адбіралі карціны для праграмы?***

— Нам дасылалі афіцыйныя заяўкі, але, апроч гэтага, я атрымаў шмат спасылак і дыскаў ад рэжысёраў пасля свайго красавіцкага візіту ў Мінск, дзе на адмысловай сустрэчы з беларускімі фільммэйкерамі я заахвоціў іх прапаноўваць свае работы. Я паглядзеў усё, што атрымаў, — у цэлым каля ста фільмаў.

***— Сёння незалежнае кіно ў Беларусі перацягвае на сябе коўдру, і хоць гэта сапраўды найцікавейшыя работы на нашай прасторы, яны часта застаюцца аматарскімі. У праграму «Special: Belarus» вы адабралі шмат такіх фільмаў. Мне падаецца, гэта толькі падкрэслівае няспеласць беларускага кінематографа, хоць некаторыя імёны і карціны маглі б дапамагчы стварыць яго больш прэзентабельны вобраз.***

— Мы не ставілі за мэту прадэманстраваць усю разнастайнасць беларускіх фільмаў, уключаць у праграму рэтраспектыўныя паказы і паказаць развіццё беларускага кіно ад пачатку да сённяшняга дня. Мы хацелі даць уяўленне пра тое, што такое беларускі кінематограф сёння; паказаць, пра што імкнуцца выказацца маладыя людзі (а вы бачыце, што большасць беларускіх фільммэйкераў з нашай праграмы — моладзь, што здымае без падтрымкі і вялікіх бюджэтаў). На мой погляд, наша праграма здольна адлюстраваць, што адбываецца ў вашай краіне, хоць, вядома, такім чынам немагчыма стварыць завершаны вобраз. Але тут будуць паказаны вельмі розныя — ігравыя і дакументальныя, сур'ёзныя і смешныя карціны, маленькія анімацыйныя работы, эксперыментальныя, што мне падаецца незвычайным для беларускага кіно, кароткаметражкі праекта «Хранатоп». Мы хочам паказаць аўдыторыі, у тым ліку прафесійнай, якая не мае ніякага ўяўлення пра беларускае кіно, што гэта такое.

***— Калі я правільна разумею, вы хацелі паказаць, што хвалюе беларускіх кінематаграфістаў, адпаведна і грамадства, але праграма, што будзе прадэманстравана на Котбускім кінафестывалі, як мне падаецца, не здольная стварыць прывабны вобраз беларускага кіно.***

— Я так не думаю. Для мяне гэта добры вобраз кінематаграфіі, якая ўключае ў сябе тэмы, важныя не толькі для Беларусі, але і для ўсяго свету. Напрыклад, навакольнае асяроддзе, дамашні гвалт у дачыненні да жанчын, жыццё на мяжы (у гэтым выпадку на мяжы паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам), якая раздзяляе сваякоў. Мне было цікава паглядзець дакументальную карціну «Тэст-730» пра маладых людзей, якія пасля заканчэння навучання атрымліваюць вопыт у месцы, куды іх размеркаваў універсітэт. Героі сустракаюцца з рэчаіснасцю, задаюцца пытаннем, добрая яна ці не, як яны могуць выкарыстаць гэты час. У Германіі маладыя людзі свабодныя рабіць тое, што яны хочуць, часта ўжо праз год ці два пасля пачатку навучання ва ўніверсітэце яны разумеюць, што выбралі няправільны накірунак, і пачынаюць нешта новае. Яны крыху разгублены перад такой колькасцю магчымасцяў, бо гэта складана — зразумець, чаго ты хочаш. Мне падаецца цікавым, што ўсе маладыя людзі, паказаныя ў фільме «Тэст-730», у выніку кажуць, што размеркаванне было для іх добрым досведам і яны шмат чаму навучыліся. То-бок, калі ты вымушаны рабіць нешта, што табе не падабаецца, і ты быццам губляеш час, калі ты не можаш зрабіць выбар сам, гэта не значыць, што ты не можаш атрымаць выгаду, што вельмі добра паказана ў фільме праз маладых доктара, геолага і настаўніка танцаў. Гэта толькі адзін прыклад, але я мог бы працягнуць і з іншымі фільмамі, якія выкрываюць, пра што думаюць маладыя людзі і як спрабуюць знайсці сваё месца ў грамадстве і жыцці.

***— Магчыма, для паказу спецыяльнай праграмы беларускага кіно на еўрапейскім кінафестывалі наша кінематаграфія пакуль не дасягнула належнага ўзроўню і варта было б пачакаць некалькі гадоў, каб прадставіць сапраўды моцную праграму.***

— Я так не думаю, на мой погляд, мы сабралі вельмі рэспектабельную праграму, агляд розных фільмаў, розных формаў і розных тэм. Сапраўды, не шмат фестываляў робяць праграмы беларускага кіно, але яны пра яго проста не ведаюць. У Котбусе нам таксама спатрэбілася шмат часу, каб прыехаць у Беларусь і паглядзець, што тут адбываецца. Ваша краіна для нас — terra incognita, шмат людзей не ведаюць, што гэта такое; калі я збіраюся наведаць Беларусь, некаторыя пытаюцца ў мяне, куды я еду, дзе такая краіна знаходзіцца. Гэта адна з прычын, чаму беларускія фільмы не трапляюць на вялікія кінафестывалі: Беларусь проста не прарэкламавана за мяжой сваімі фільмамі. Таму беларускія фільммэйкеры не едуць на вялікія фестывалі і не маюць бізнес-кантактаў, ваша краіна вядомая якраз у сектары вытворчасці, таму што вытворцы з іншых краін ведаюць, што пры стварэнні тэлесерыялаў альбо іншых праектаў могуць карыстацца пляцоўкамі, абсталяваннем і таннай рабочай групай у Беларусі. Але прадзюсарам у гэтай краіне няма чаго рабіць.

**Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by.**

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ У закрытай прасторы

# НАШЫ ФАТОГРАФЫ-ЖАНЧЫНЫ ПАКАЗВАЮЦЬ БЕРЛІНУ САВЁ БАЧАННЕ РЭАЛЬНАСЦІ

**Мы толькі што вярнуліся з утульнай берлінскай галерэі aff, дзе 20 кастрычніка адкрылася выстаўка дванаццаці актуальных беларускіх фатографаў «Hold on/Let Go». Таццяна Лісоўская, Каця Смурага, Аляксандра Салдатава, Вольга Бубіч, Настасся Храловіч, наша калега Надзея Бужан і іншыя прадставілі ў Берліне свае дакументальныя, канцэптуальныя, асабістыя праекты. Чорна-белыя здымкі жыхаркі вёскі Зембін на белых сценах галерэі, кароткі фільм пра невідушчую жанчыну Наталлю Кавалевіч, праекцыя аўтарскіх серый беларускіх фатографаў-жанчын — асаблівая для нас экспазіцыя адкрылася для наведвальнікаў адным восеньскім вечарам у Берліне.**

Галерэя aff утрымліваецца некалькімі фатографамі, сярод якіх, як яна сама сябе называе, канэктар выстаўкі «Hold on/Let Go» Франка Вольт. Ужо некалькі гадоў яна кантактуе з калегамі з Усходняй Еўропы: яшчэ ў 2012 годзе ў галерэі aff яна арганізавала выстаўку трох фотамастакоў з Грузіі, Украіны і прадстаўленай Аляксандрам Веледзімовічам Беларусі. Франка Вольт кажа, што хацела паказаць гледачу «рознае візуальнае і тэматычнае натхненне», таму што ў маладой нямецкай фатаграфіі дамінуюць некалькі вядомых фоташкол, і ў тым ліку Becher school.

Пасля арганізаванай экспазіцыі Франка асабіста наведала Беларусь, дзе пазнаёмілася з беларускай фатаграфіяй і беларускімі фатографамі бліжэй. «Мне падалося, што на сцэне беларускай маладой фатаграфіі жанчыны вельмі актыўныя і ўплывовыя. Я сама жанчына і ведаю, што з тым, каб цябе ўспрымалі і табе плацілі на адным узроўні з мужчынамі, узнікаюць цяжкасці. У мяне з'явілася ідэя ўдзяліць жанчынам-фатографам з Беларусі асобную ўвагу, таму што, як я заўважыла, іх праекты вельмі напружаныя і глыбокія: пра асабістыя гісторыі,



сацыяльныя ўмовы і структуры, вельмі разумнае і высокага ўзроўню мастацтва з усіх бакоў».

Выстаўка «Hold on/Let Go» паказвае розныя стылі фатаграфіі і розныя спосабы рэалізацыі сваіх ідэй беларускімі фотамастачкамі. Напрыклад, пасля наведвання Франкай выстаўкі Belarus Press Photo ў 2015 годзе будучай экспазіцыі быў забяспечаны журналісцкі погляд праз работы Надзеі Бужан, Настассі Храловіч і Вольгі Бубіч. Нельга было абысціся без канцэптуальных работ, якія ў галерэі aff зараз прадстаўлены Марыяй Святагор, Лесяй Пчолкай, Святланай Ярковіч і Жаннай Гладко. «Яны выкарыстоўваюць прастору фатаграфіі вельмі сучасна і адкрыта, не як сродак дакументацыі. Для перадачы сваіх ідэй у памяшканні для аўдыторыі яны камбінуюць, напрыклад, калаж, відэафільм і спецыяльны тып тактыльнай інсталяцыі». Сюды ж уключаны партрэтныя фотаработы Юліі Назаравай і Таццяны Шчарбіны.

«Я хацела прадставіць у галерэі не так добра вядомых аўтараў і падтрымаць маіх фаварытаў. Вядома, я кіравалася тэмамі: хацела паказаць шмат розных гісторый, але ў выніку атрымалася, што амаль усе прадэманстраваныя ў галерэі aff праекты датычацца сацыяльных і культурных умоў маладога пакалення ў Беларусі, становішча жанчын і тэмы сям'і. Гэта здарылася само сабой, без майго кіравання, — кажа Франка Вольт. — Нямецкія фатографы называюць сябе проста фатографамі. Гэта незвычайна — сказаць, што ты «візуальны мастак», і бачыць медыяасяроддзе шырэйшым, у цеснай сувязі з відэа і мастацтвам калажа. Гэта будзе добрым натхняльным унёскам для маёй берлінскай аўдыторыі. Трэба сказаць яшчэ, што ў беларускай фатаграфіі вельмі эмацыянальны і эстэцкі падыход, які моцна адрозніваецца ад сучаснай нямецкай фатаграфіі. Я не хачу сказаць, што яна не кажа пра рэальнасць, але сацыяльныя пытанні яна перадае паэтычна, дае гледачу магчымасць аб'яднаць факты з эмоцыямі. Беларускія фатографы маюць што расказаць пра сваю краіну і пра грамадства, у якім яны жывуць. І гэта вельмі цікава для берлінскай аўдыторыі, таму што гэта іншая сацыяльная і палітычная сітуацыя, пра якую мы павінны ведаць больш».

Выстаўка ва ўтульнай галерэі на ўтульнай берлінскай вулачцы з ліхтарамі і пажаўцелым лісцем, дзе кожны мінак можа адрэагаваць і нават з бутэлькай піва ў кішэні зайсці паглядзець, што на гэтых сценах вісіць (я сапраўды такіх бачыла), магчыма, не будзе нечым надзвычайным для насычанага падзеямі Берліна, затое шматпланава паказа фатаграфію беларускіх жанчын. Спадзяёмся, экспазіцыя, што працягнецца ў галерэі aff да 12 лістапада (калі хто будзе ў Берліне, можа завітаць), будзе мець працяг.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*



# ПАЛЁТЫ Ў МАРАХ І НАЯВЕ

## Валянцін Елізар'еў аднаўляе балет «Спартак»

**Пасля доўгага перапынку ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі зноў ідуць рэпетыцыі пад кіраўніцтвам Елізар'ева. Ён працуе над адной, але вельмі знакавай пастаноўкай — балетам «Спартак», прэм'ера якога ў беларускім тэатры адбылася ў 1980 годзе і мела рэзананс далёка за межамі рэспублікі. «Спартак» вяртаецца на сцэну дзякуючы 70-гадоваму юбілею балетмайстра: паказ спектакля 31 кастрычніка стане першай часткай сустрэч з майстрам у тэатры, дзе ён служыў, прыехаўшы ў Беларусь з Ленінграда па размеркаванні ў 1973 годзе. З таго часу пачалася новая гісторыя беларускага балета, калі ён на некалькі дзесяцігоддзяў стаў мастацкім брэндам ужо незалежнай краіны. Гэта зрабіў Елізар'еў, які быў галоўным балетмайстрам, пазней дырэктарам — мастацкім кіраўніком Тэатра балета, у якім працаваў да 2009 года. Цяпер з'яўляецца прафесарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.**


Фота Кастуся ДРОБАВА.

Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ падчас рэпетыцыі.

35 гадоў жыцця ў Вялікім тэатры Беларусі, за якімі — і яго персанальныя перамогі на прэстыжных конкурсах ды за савецкім часам славутыя зоркі балета звярталіся да балетмайстра з Мінска ў пошуках арыгінальнай сучаснай харэаграфіі. Напрыклад, Мая Плісецкая (для яе ствараўся фільм-балет) ды Андрыс Ліепа з Нінай Ананіяшвілі (пастаноўка Елізар'ева прынесла перамогу савецкаму балету на конкурсе ў Амерыцы). Ён меў сваё бачанне ва ўсім: калі паставіў «Тыль Уленшпігель», аказалася, што твор беларускага кампазітара Яўгена Глебава можа быць запатрабаваны не толькі тут, і з'явілася пастаноўка ў Ленінградскім тэатры оперы і балета імя Кірава. Нават у класічным «Шчаўкунку» Чайкоўскага ён мог сабе дазволіць адысці ад харэаграфіі Марыуса Пеціпа і прапанаваць сваю версію. Балет «Страсці» (пра драматычны лёс Рагнеды) беларускага кампазітара Андрэя Мдзівані прынёс пастаноўшчыку прэстыжную ўзнагароду «Бенуа дэ ля Данс» у Парыжы. Яго запрашалі ствараць спектаклі па ўсім свеце, але дом — так павярнулася жыццё — быў у Беларусі.

